Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ПВР

СТУДЗЕНЬ 21 1934 г. НЯДЗЕЛЯ № 17 (4850) Год выдання XVII

Пролетарыі усіх краін, злучайцеся!

Всесоюзная библиотека имени Ленина

СЕННЯ У НУМАРЫ:

ПАСТАНОВА СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗА ССР І ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА ВКП(б) АБ ЗАКУПЦЫ ХЛЕБА СІСТЭМАЙ СПАЖЫВЕЦКАЙ КААПЕРАЦЫІ.

ТЭЗІСЫ ДА 10-ГОДДЗЯ СМЕРЦІ В. І. ЛЕНІНА. ЛЕНІН—ВЯЛІКІ АСНОВАПАЛОЖНІК САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА.

РЭЗАЛЮЦЫЯ МАСКОЎСКАЙ АБ'ЯДНАНАЙ VI АБЛАСНОЙ І III ГАРАДСКОЙ ПАРТКАНФЕРЭНЦЫІ ПА ДАКЛАДУ ТАВ. КАГАНОВІЧА АБ РАБОЦЕ ЦК ВКП(б).

XV З'ЕЗД КП(б)Б. ПРАМОВА ТАВ. АНЦІПАВА.

НІЗАЎЦОЎ — УЗЯЦЬ У 1934 ГОДЗЕ ЯШЧЭ БОЛЬШЫ УРАДЖАЙ.

УДЗЕЛ БССР НА ВЫСТАЎЦЫ, ПРЫСВЕЧАНАЙ XVII З'ЕЗДУ ВКП(б).

АБ ЗАКУПЦЫ ХЛЕБА СІСТЭМАЙ СПАЖЫВЕЦКАЙ КААПЕРАЦЫІ

Пастанова Совета Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральнага Камітэта ВКП(б)

З прычыны звароту раду сельсп[illegible] і таварыстваў, райсаюзаў спажыў[illegible] кааперацыі, Цэнтрасаюза з хадайн[illegible]твам аб дазволе рабіць закупку [illegible]леба ў абласцях, краях і рэспубліках, у якіх дазволен калгасны і ед[illegible]асобна-сялянскі гандаль хлебам, [illegible]вет Народных Камісараў СССР і [illegible]нтральны Камітэт ВКП(б) пастанаўляюць:

1. Дазволіць Цэнтрасаюзу правод[illegible]ць праз сістэму спажыўкааперацыі закупку хлеба ў памерах не [illegible]льш 100 млн. пуд. па СССР у цэлым, у тым ліку:

[illegible]а Паўночнаму краю не больш [illegible] млн. пудоў; па Ленінградскай [illegible]бласці не больш 1,2 млн. пудоў; [illegible] Заходняй вобласці не больш 1,8 [illegible] пудоў; па Маскоўскай вобласці [illegible] больш 2-х млн. пудоў; па Іва[illegible]скай вобласці не больш 1,5 млн. [illegible]доў; па Горкаўскаму краю не [illegible]льш 4,5 млн. пудоў; па б. Уральскай вобласці не больш 6 млн. пудоў; па Башкірыі не больш 4 млн. [illegible]доў; па Татарыі не больш 7 млн. [illegible]доў; па Сярэдня-Волжскаму краю [illegible] больш 7 млн. пудоў; па Ніжня-Волжскаму краю не больш [illegible] млн. пудоў; па ЦЧВ не больш 6 [illegible]н. пудоў; па б. Паўночна-Каўказскаму краю не больш 6 млн. пудоў; [illegible] Крыму не больш 1,5 млн. пудоў; [illegible]Казахстану не больш 2,5 млн. пудоў; па Заходня-Сібірскаму краю [illegible] больш 9 млн. пудоў; па Усходня-Сібірскаму краю не больш 1,5 [illegible] пудоў; па Украіне не больш [illegible] млн. пудоў; па Беларусі не [illegible]льш 2-х млн. пудоў; па Закаўказскіх рэспубліках не больш 0,5 млн. [illegible]доў; па рэспубліках Сярэдняй [illegible] і Кіргізіі не больш 1,5 млн. пудоў; па Данёва-Усходняму краю не [illegible]льш 0,5 млн. пудоў.

2. Устанавіць, што закупка хлеба [illegible]змай спажыўкааперацыі павінна [illegible]правоўіцца па цэнах — пшаніцы [illegible] 25 проц. і іншыя зернавыя культ[illegible]ры на 20 проц. вышэй існуючых [illegible] на хлеб па абавязковых пастаўках хлеба дзяржаве з абавязковым забеспячэннем калгасаў, калгаснікам і працоўным аднаасобнікам, пра[illegible]шым хлеб кааперацыі, магчымасці куплі неабходных ім прамысловых тавараў на суму ў 3 разы больш шую кошту праданага ім хлеба.

3. Устанавіць, што продаж свайго хлеба на гарадскіх і сельскіх рынках і чыгуначных станцыях іншым пакупцам, акрача кааперацыі, калгасы, калгаснікі і працоўныя аднаасобнікі могуць рабіць па цэнах, якія складаюцца на рынку.

4. Указаць мясцовым органам улады і работнікам спажыўкааперацыі, што закупка хлеба можа рабіцца толькі на аснове добраахвотнай згоды калгаса, калгасніка і працоўнага аднаасобніка і павінна быць арганізавана на аснове забеспячэння заціснутасці прадаўца ў продажы навіўных у яго пішкаў хлеба кааперацыі, ні ў якім разе не дапускаючы якога-б там ні было адміністрацыйнага прымусу.

5. Безумоўна забараняцца партыйным і савецкім органам устанаўліваць для калгасаў, калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў якія-небудзь абавязковыя заданні, развёрстку ці планы продажы хлеба.

6. Папярэдзіць усе совецкія і партыйныя арганізацыі і ўсіх работнікаў спажыўкааперацыі, што ўстанаўленне якіх-бы там ні было цвёрдых заданняў і планаў продажы хлеба для калгасаў, калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў будзе разглядацца як дача сустрэчных планаў, і вінаватыя ў гэтым асобы ў адпаведнасці з пастановаю СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 20-га чэрвеня 1933 г. будуць прыцягвацца да крымінальнай адказнасці.

Старшыня Совета Народных Камісараў СССР
В. МОЛАТАЎ (СКРЯБІН).

Сакратар Цэнтральнага Камітэта ВКП(б)
І. СТАЛІН.

Комуністычнай партыі Беларусі

рапарту брыгадзіраў лепшых вытворчых брыгад прадпрыемстваў Віцебска)

[illegible]АРАГІЯ ТАВАРЫШЫ, ДЭЛЕГА[illegible]Х У З'ЕЗДА.

[illegible]ваю, гамленне аб скліканні XVII [illegible]да ВКП(б) і XV з'езда КП(б)Б [illegible]йшоў сярод нас, як і ўсіх рабо[illegible] і працоўных Віцебска, жывей [illegible] гарачы водгук.

[illegible]ы зразумелі, што з'езды партыі [illegible]ць сусветна-гістарычнае значэн[illegible] і іх трэба сустрэць балывмі р[illegible]ньмі справамі ў барацьбе за [illegible]н, за высокую якасць работы.

[illegible] першых чыслах снежня лепшая [illegible]гада КАВАЛЁВАЙ (швэйма-ні[illegible]ны, цэх фабрыкі імя Клары Цэт[illegible]ны) звярнулася з пісьмом да ўсіх [illegible]рыгад Віцебска. Яна праз газету [illegible]цебскі пролетарый» прапанавала [illegible]ніжэць агульнагарадзкое со[illegible]лістычнае спаборніцтва вытвор[illegible] брыгад прадпрыемстваў за пра[illegible]падпісаць рапарт з'ездам партыі [illegible] тым, якіх перамог дабіваюцца [illegible]рныя брыгады ў барацьбе за [illegible]льшэвіцкія тэмпы і за высокую [illegible]сць.

[illegible] гэтага і пачалося. Заклік брыга[illegible] Кавалёвай падхапілі сотні бры[illegible] і істэжні, змены і ўчасткі фабрык [illegible]завода ў Віцебска.

[illegible]ут дапамагла нам і масавая ра[illegible]. Ні было таго дня, каб нашы [illegible]гады на праводзілі нарад, на [illegible] падводзіліся вынікі работы за [illegible]ень. На гэтых брыгадных нарадах [illegible] абгаварвалі канкрэтна, як хто [illegible]конвае промфінплан. Што яшчэ за [illegible]пачыла нам поспех—гэта апера[illegible]ны ўлік у саміх брыгадах. Варта [illegible]кі прэйсці па цэхах нашых [illegible]прадпрыемстваў, напрыклад, па ва[illegible]наму цэху фабрыкі «ДЗВІНА», па [illegible]чкаму цэху фабрыкі «СЦЯГ ІН[illegible]СТРЫЯЛІЗАЦЫІ» і інш., як ад[illegible]у відаць на чырвоных дошках [illegible] работы на толькі ўсёй брыга[illegible] але і кожнага ўдарніка ў па[illegible]бку.

[illegible]СЯ ВІЦЕБСКАЯ ПРАМЫСЛО[illegible]СЦЬ ВЫКАНАЛА ЗА ПЕР[illegible]Ю ДЗКАДУ СТУДЗЕНЯ СВОЙ [illegible]АН НА 99,3 ПРОЦАНТЫ (не [illegible]ночаючы фабрыку імя КІ'М), [illegible] пічба з'яўляецца небывалай ва [illegible] работе віцебскай прамысловас[illegible]. Усё гэта, безумоўна, вынік што[illegible]нага большэвіцкага кіраўніцтва [illegible] КП(б)Б на чале з тав. ГІКАЛО, [illegible]ай кіраўніцтва абкоўленага скла[illegible] гаркома КП(б)Б, вынік нашага [illegible]ыялістычнага стаборніцтва.

[illegible]ось, напрыклад, брыгада Іохізава [illegible]лася выкананне плана ў пад[illegible]рнай ёй адстаючай брыгадзе Бло[illegible]. Яна вылучыла туды лепшых [illegible]рнікаў, якія непасрэдна ўзяліся [illegible]перадачу вопыту і навучыла [illegible]гаду Блоха працаваць паўдарна[illegible].

[illegible]выконваючы прамфінплан, мы зра[illegible] ўпор на якасць прадукцыі, аў[illegible]ане тэхнікай, на тое, каб совец[illegible] прадукцыя была высокакас[illegible] і лепшай у свеце. Мы моцна і [illegible]руча паставілі пытанне перад [illegible]каробамі — або працуйце добра [illegible]ленна, як ударнікі, спыніце па[illegible]. наша социялістычнае добро, [illegible] ідзіце прэч з нашай ударнай [illegible]гады.

[illegible] за час нашага спаборніцтва [illegible]т бракаробаў выправілася. Вось [illegible] брыгадзе шліфавальнікаў ЗЫ[illegible]А (акупярная фабрыка) рабочы [illegible]ДКІН сістэматычна рабіў брак. [illegible] сваім сходзе брыгада рашуча [illegible]ставіла пытанне, выключыла яго [illegible] складу брыгады на два месяцы [illegible]ўна. Гэта мера грамадскага ўп[illegible]льву зрабіла моцнае ўздзеянне на Дудкіна. Ён пачаў лепш працаваць і цяпер нельга пазнаць былога бракароба Дудкіна. А на абутковай фабрыцы імя Лекерта было праведзена такое мерапрыемства: за вячэрай у фабрычнай сталоўцы сабралася тры брыгады: МІЛЬМАНА, ЯНКОЎСКАГА і БАЛАШОВА са сваімі жонкамі і дзецьмі. Абгаварылі пытанне — чаму наш абутак нізкай якасці. Абутнікі цвёрда парашылі, што совецкі абутак павінен, і можа быць лепшым, моцным і больш прыгожым, чым ва ўсім свеце. І вынікі аказаліся ў наяўнасці. Зменшылася ў гэтых брыгадах процант нізкапатуковасці. Брыгады пачалі працаваць значна лепш.

Мы, брыгадзіры, пачалі цікавіцца жыццём нашых ударнікаў, хадзіць к ім на кватэры, клапаціцца аб іх патрэбах. У брыгадзе КАМІНСКАЙ (фабрыка імя Клары Цэткін) быў такі факт. Бачыць брыгадзір, што работніца КВЯТКОЎСКАЯ неяк адстае ад жыцця ўсёй брыгады, не бывае на сходах, не наведвае палітзанятку, палітвучобы і т. д. Парашылі дазнацца на кватэру да Квяткоўскай, каб ведаць, чым яна хварэе. Высветлілася, што яна жыве ў выключна дрэнных жыллёвых умовах. Брыгада паставіла пытанне перад цэхкомам і Квяткоўская атрымала кватэру. Куды лепш пашла ў яе зараз работа. Таксама і брыгадзір Шчарбакова (акупярная фабрыка) пабывала на кватэрах усіх рабочых і цікавілася, хто як жыве. Пасля работніцы ГІНДЗІНАЙ адраментавалі кватэру, работніца ІВАНОВА атрымала для сына пуцёўку на курорт.

Мы сёння ганарымся, што сярод нас ёсць шмат брыгадзіраў-комуністаў, якія паказалі сапраўдныя прыклады работы (ІОХІЗАЎ, КАМІНСКАЯ, ГУДКІН, БУШУЕЎ і інш. Апошнія два выбраны дэлегатамі на XV з'езд).

Але многа яшчэ большэвіцкай работы нас чакае ўперадзе. Мы распрацавалі тэзісы т. т. МОЛАТАВА, КУЙБЫШАВА І КАГАНОВІЧА, пастанову снежаньскага пленума ЦК КП(б)Б аб нацыянальнай палітыцы. Мы ўпэўніліся, што ўсё гэта ад нас патрабуе яшчэ больш напружанай работы, узняцця вышэй пролетарскай класавай пільнасці, каб недапусціць прорываў у другім годзе 2-й пяцігодкі, пакончыць раз назаўсёды з адставаннем нашай віцебскай прамысловасці, каб яна заняла перадавое месца ва ўсёй нашай рэспубліцы. За гэта мы, лепшыя брыгадзіры, будзем паўдарнаму змагацца, памнажаючы наш вопыт на ўсіх вытворчых участках. ЗАРУКАЙ ГЭТАМУ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ТОЕ, ШТО НАМІ КІРУЕ ПАРТЫЯ ЛЕНІНА, ШТО НАМІ КІРУЕ НАШ ПРАВАДЫР ТАВ. СТАЛІН.

Мы перадаем пролетарскае таварыскае, гарачае прывітанне кіраўніку КП(б)Б Нікалаю Фёдаравічу ГІКАЛО, першаму ўдарніку Совецкай Беларусі. Жадаем яму многа сіл і здароўя ў яго адказнай рабоце.

Няхай жыве партыя Леніна-Сталіна!

Няхай жыве XV з'езд большэвіцкай Беларусі!

Няхай жыве вялікі інжынер пабудовы социялізма ў нашай краіне— наш дарагі і горача любімы ІОСІФ ВІСАРЫЁНАВІЧ СТАЛІН!

XV З'ЕЗД КП(б)Б

ПРАМОВА тав. АНЦІПАВА

Таварышы, дазвольце мне, перш за ўсё, перадаць вашаму з'езду гарачае большэвіцкае прывітанне ад тав. Кагановіча (бурныя апладысменты).

Тав. КАГАНОВІЧ, у якога я прасіў дазволу прыехаць к вам на з'езд, паколькі я дэлегат маскоўскай канферэнцыі, даручыў мне перадаць большэвікам Беларусі гарачае прывітанне (апладысменты).

Таварышы, карыстаючыся ручным выпадкам, я хачу некалькі слоў сказаць вам аб маскоўскай арганізацыі. Я маскоўскую арганізацыю ведаю ўжо даўно. Я сам працаваў у ёй, а працуючы ў саюзных арганізацыях, не адрываўся ад маскоўскай арганізацыі. Я павінен сказаць, што ніколі яшчэ такой згуртаванасці, такой аднадушнасці, такой маналітнасці вакол ЦК партыі, вакол правадыра нашай Усесаюзнай Комуністычнай партыі тав. Сталіна ў маскоўскай арганізацыі яшчэ не было. (Апладысменты).

Голас: Няхай жыве лепшы саратнік тав. Сталіна — тав. Кагановіч! (Ура! Апладысменты).

Гэта тлумачыцца тымі гістарычнымі дасягненнямі, якія мае наша партыя ва ўсіх галінах гаспадарчага будаўніцтва. Гэта тлумачыцца непрымірымай класавай палітыкай, цвёрдым правядзеннем ленінскай лініі ў маскоўскай арганізацыі. Гэта, таварышы, з'яўляецца результатам як актыўнай дапамогі ў рабоце маскоўскай арганізацыі з боку тав. Сталіна, так і непасрэднай штодзённай работы бліжэйшага саратніка, першага сталінца — тав. Кагановіча (Апладысменты).

Тав. Кагановіч, в'яўляючыся сакратаром ЦК, у той-жа час з'яўляецца непасрэдным кіраўніком маскоўскай партарганізацыі. Ён здолеў спалучыць агромадную работу па кіраўніцтву ўсёй арганізацыйнай дзейнасцю нашай партыі з самым непасрэдным кіраўніцтвам маскоўскай арганізацыяй, і не было ні адной дробязі ў рабоце маскоўскай арганізацыі, у якую-б не ўнікаў тав. Кагановіч, не было ні адной галіны гаспадаркі, якой-бы ён не даваў дырэктывы.

Дэлегаты канферэнцыі, выступаючы ад шматлікіх фабрык і заводаў, расказвалі аб гэтай непасрэднай рабоце і непасрэдным кіраўніцтве тав. Кагановіча.

Я думаю, наша задача — вучыцца працаваць так, як працуе маскоўская арганізацыя, як працуе тав. Кагановіч. (Апладысменты).

Закранаючы вынікі чыткі, я хачу падкрэсліць, што беларуская арганізацыя аказалася ў асноўным аладовай арганізацыяй — арганізацыяй згуртаванай на асноне генеральнай лініі нашай партыі, згуртаванай вакол канкрэтных задач, пастаўленых ЦК нашай Усесаюзнай Комуністычнай партыі, згуртаванай вакол правадыра нашай партыі тав. Сталіна. У асаблівасці за апошні год арганізацыя дабілася вялікіх дасягненняў, усе гаспадарчыя кампаніі бягучага года ў асноўным праведзены адвальняюча. Гэта, безумоўна, з'яўляецца вялікім дасягненнем беларускай партыйнай арганізацыі.

Побач з гэтым, таварышы, побач з станоўчымі моментамі мы выявілі даволі значныя недахопы як у галіне партыйнай работы, так і ў галіне гаспадарчай. Унутрыпартыйная работа аказалася не на вышыні, пачынаючы ад самага прыёму ў партыю і канчаючы скарыстаннем кожнага члена партыі, гэта работа пастаўлена вельмі слаба, знаходзіцца на нізкім узроўні. Таксама ў галіне гаспадарчай, практычнай работы чыстка ўскрыла цэлы рад вельмі вялікіх недахопаў. Усе гэтыя недахопы даволі падрабязна паданы ў той рэзалюцыі, якая была прынята пленумам ЦК і ЦКК КП(б)Б. Трэба, таварышы, каб уся арганізацыя асноўнай сваёй задачай паставіла барацьбу з тымі недахопамі, якія выяўлены, каб барацьбу з гэтымі недахопамі зрабіць стрыжнем работы, бо, таварышы, ад таго, як мы ліквідуем гэтыя недахопы, будуць залежаць поспехі далейшай работы. Трэба пра вільна пабудаваць партыйную работу. Калі кожны член партыі будзе адчуваць адказнасць за партыю ў цэлым, за канкрэтныя справы, якія яму даручаны, калі ліквідуем атрамадныя недахопы, якія ёсць у пасобных месцах, у першую чаргу ў сельскай гаспадарцы і на культурным фронце, то, таварышы, Беларуская рэспубліка рушыцца наперад яшчэ больш шпаркімі крокамі.

Галоўнае, што вам у Беларусі трэба памятаць, гэта тое, што вы знаходзіцеся на перадавым авангардным посту, вы з'яўляецеся палрэдніцкай саюзнай рэспублікай, за вашай работай, за вашымі дасягненнямі і недахопамі ў вашай рабоце сочаць в таго боку граніцы, і таму ад таго, як працуеце, якія ў вас ёсць практычныя дасягненні або недахопы, за лежыць многае. Чым лепш будзем працаваць, чым больш у нас будзе дасягненняў, тым, таварышы, лепшай будзе барацьба за Совецкі Саюз, за сусветную пролетарскую рэвалюцыю, тым больш будзе сімпатый працоўных на нашым баку, тым больш упэўненасці будзе ў тым, што на нас напасці не адважацца, бо, нападаючы на нас, вогалі будуць атрымлівать удар у тыл. Калі адважацца напасці, мы палрытуем такі рэзерв, які ўжаб'е асінавы кол у магілу сусветнай буржуазіі. (Апладысменты).

Таму, таварышы, трэба ўважліва адносіцца нават да кожнай дробязі. Трэба, каб кіраўніцтва было канкрэтнае, штодзённае, якое даходзіла-б да калгаса, да калгасніка.

Прыклады ўзорнай работы ў нас ёсць. Возьміце пісьмо к тав. Сталіну ад кабардзінцаў. Яны ў сваім пісьме к тав. Сталіну пісалі: «Мы запэўняем, што ў нас у гэтым годзе не застанецца ні аднаго непісьменнага, ні аднаго раздзетага, ні аднаго разутага». Яны склалі брыгады з лепшых людзей, з лепшых калгаснікаў, абходзяць кожны дом, гутараць з кожным калгаснікам, як ён жыве, якія ў яго недахопы, што ён робіць, якія ў яго патрэбы, забяспечваюць яму дапамогу, калі ён адчувае патрэбу. Абяцанне кабардзінцаў тав. Сталіну — не пустыя словы. Гэта абяцанне людзі правяраюць у жыцці.

Тым больш энергіі павінна быць у вас. Вы на граніцы, вы павінны паказаць лепшыя ўзоры работы. Трэба толькі пабольшэвіцку працаваць, тады і вы даб'ецеся таго, што не будзе ў вас ні аднаго раздзетага, ні аднаго разутага, ні аднаго непісьменнага. Усё залежыць, таварышы, ад вас самых.

Для гэтага трэба асабліва вострае паставіць пытанне аб крытыцы ўсіх недахопаў, аб самакрытыцы. Зразумела, самакрытыка была разгорнута ў дастатковай ступені і ў вас. Але гэтага мала. Трэба яшчэ больш разгарнуць нашу большэвіцкую самакрытыку і ў адносінах арганізацый і адзельных асоб. Трэба, каб і арганізацыі і адзельныя асобы самакрытыкі не баяліся, не цураліся яе.

Я хачу адзначыць яшчэ адзін момант. Вывучаючы работу арганізацыі, вывучаўшы сістэму кіраўніцтва, я лічу неабходным заявіць, што кіраўніцтва беларускай арганізацыі з'яўляецца большэвіцкім, сталінскім кіраўніцтвам (бурныя апладысменты). Гэта дае мне поўную ўпэўненасць сказаць, што пры гэтым кіраўніцтве тыя недахопы, якія мы выявілі, і недахопы, якія, натуральна, у працэсе работы будуць, паболь шэвіцку будуць перамагацца, што беларуская арганізацыя ў бліжэйшы час выйдзе ў лік перадавых большэвіцкіх арганізацый нашага Саюза (апладысменты).

Тав. Анціпаў, пераходзячы да характарыстыкі міжнароднага становішча СССР, дае яркі малюнак дасягнутых намі поспехаў у знешняй палітыцы і ў барацьбе за мір.

Гэтыя поспехі базуюцца на ўмацаванні эканамічнай і ўзброенай магутнасці Совецкага Саюза.

СССР, дзякуючы ленінскай палітыцы ў міжнародных пытаннях, стаў буйнейшым фактарам міжнароднага жыцця. Да нашага голаса ў сучасны момант уважліва прыслухоўваюцца ва ўсім свеце.

Аднак, як-бы ні былі вялікі дасягнутыя намі поспехі ва ўмацаванні знешня - палітычнага становішча СССР, мы з ранейшай пільнасцю па вінны сачыць за манеўрамі антысавецкіх, імперыялістычных сіл, асабліва германскага фашызма, японскай ваеншчыны і англійскага імперыялізма, каб быць гатовымі да ўсялякіх нечаканасцяй. Задача беларускай партыйнай арганізацыі, працуючай на граніцы СССР з капіталістычным светам, яшчэ больш павысіць увагу да ўмацавання нашай абароназдольнасці.

Спыняючыся на апублікаваных тэзісах ЦК ВКП(б) к XVII з'езду, тав. Анціпаў гаворыць:

— Першую пяцігодку мы пазвалі планам вялікіх работ. Мы ў гэтым плане сапраўды намячалі гіганцкія тэмпы, якімі не развівалася ні адна капіталістычная краіна ў самы лепшы, самы спрыяючы для іх час. Мы гэты план выканалі. Мы здолелі за гэтыя гады стагоддзямі складўшыйся тып гаспадаркі, дробную, індывідуальную, аднаасобную гаспадарку перавесці на рэйкі калектывізацыі, на аснове калектывізацыі разграмілі ўпчэнт кулацтва як клас эксплаататараў.

Зараз мы намячаем другі пяцігадовы план. Гэты пяцігадовы план па памерах прадукцыі ў два разы больш, чым першая пяцігодка. Цікава ацэнка другой пяцігодкі з боку буржуазных газет. Адна японская газета піша так: «СССР другім пяцігадовым планам ставіць сабе казачныя мэты». Зразумела, для буржуазіі гэта казачная мэта, ёй і ва сне не могуць сніцца такія тэмпы. Для нас-жа гэта рэальны план; мы яго выканаем таксама, як выканалі першую пяцігодку. Гэта — план пабудовы бяскласавага грамадства, выканаўшы яго мы зробім гігантскі крок на шляху да стварэння комуністычнага грамадства.

Таварышы, гэты план усяляе ара малную ўпэўненасць у перамозе ў серца кожнага рабочага, кожнага калгасніка, упэўненасць у сіле нашай Комуністычнай партыі, веру і любоў да нашага правадыра тав. Сталіна (апладысменты). Кожны рабочы, кожны калгаснік ведае — раз гэты план прымаюць большэвікі, значыцца, гэты план выканаем. Ад таго, якую мы энергію разав'ём, як здолеем арганізаваць агромадную масу рабочых, калгаснікаў і пакіраваць іх на выкананне гэтага плана, залежыць усё.

Тэзісы тав. Кагановіча і таварышаў, як трэба перабудаваць, каб сапраўды ўзняць масы і стварыць такую арганізацыю, якая адпавядала-б палітычным і гаспадарчым задачам, пастаўленым другім пяцігадовым планам.

Тэзісы па арганізацыйных пытаннях уносяць зусім новы струмень, стварэнне новую арганізацыйную сістэму, такую сістэму, пры якой кожны павінен адказваць за даручаную яму справу, сістэму, даючую магчымасць велізарнай мабілізацыі ўсіх нашых унутраных рэсурсаў. А ўнутраных рэсурсаў у нас надзвычайнае мноства. Многіх мы нават і не ведаем. Перабудаваў пыся новаму, працуючы пановаму, мы здолеем мабілізаваць усе гэтыя ўнутраныя рэсурсы, не толькі вдолеем выканаць план, але і перавыканаць яго.

Зараз важна не столькі даваць дырэктывы, колькі дабіцца таго, каб адзін раз даная дырэктыва была давядзена да канца. Таму кантроль выканання — агнёва ўсёй сістэмы работы. Таму перабудоўваюцца і органы кантроля, наблізіваюцца да арганізацый, якія даюць дырэктывы і якія абавязаны за выкананнем іх сачыць.

Арганізацыйная перабудова, якую мы праводзім, ёсць сапраўды ленінская перабудова. Ленін вучыў нас працаваць, дакладна ўлічваючы абстаноўку. Намець задачы, якія трэба выканаць і ў адпаведнасці з гэтымі задачамі пабудуй сваю арганізацыю, перабудуй свае рады, выдзяліі лепшых людзей, кіруй правільна і правярай работу гэтых людзей. Вось як Ленін вучыў нас працаваць.

Таварышы, мы дасягнулі агромадных поспехаў. Гэтыя поспехі з'яўляюцца результатам таго, што наша партыя цвёрда і ўпэўнена праводзіла ленінскую палітыку. Наша партыя за гэтыя дзесяць год без Леніна ні на адзін крок не адступіла ад лініі, зазначанай Леніным. Тую клятву, якую даў тав. Сталін у дзень пахавання Леніна, наша партыя з гонарам выканала.

Мы дасягнулі такіх поспехаў дзякуючы таму, што наша партыя цвёрда і рашуча змагалася супроць усіх антыпартыйных прушоваў і адхіленняў. Многія з нам прыходзілі з усялякімі планамі: Троцкі — са сваім, Зіноўеў і Каменеў — са сваім. Потым яны аб'ядналіся. Уявіце хоць-бы на мінуту, што мы прынялі-б іх планы. Калі-б мы прынялі план Троцкага, які гаварыў, што са цыялізма ў адной краіне не пабудуеш і трэба чакаць сусветнай рэвалюцыі, гэта азначала-б, што мы яшчэ не былі-б ужо раздаўлены сусветнай буржуазіяй. Буржуазія на нас не адважылася накінуцца тоўкі таму, што мы прынялі і выконвалі план будаўніцтва социялізма ў адной краіне (апладысменты), што мы ўсе контрэволюцыйныя антыпартыйныя групоўкі разбілі ўшчэнт.

Мы, таварышы, дасягнулі такіх агромадных результатаў таму, што маем правадыра, які поўнасцю ўвасобіў у сабе ленінскія традыцыі, які не на словах, а на справе ажыццяўляе ленінізм і вядзе нашу партыю па ленінскаму шляху, мы перамаглі таму, што маем Сталіна. (Апладысменты). Мы перамаглі таму, што вакол Сталіна згуртаваліся най больш энергічныя, найбольш цвёрдыя людзі, якія з'яўляюцца яго бліжэйшымі памочнікамі, мы перамаглі таму, што маем такіх людзей, як т. т. Кагановіч, Молатаў, Арджанікідзе, Варашылаў і інш. (Апладысменты).

Таварышы, уся абстаноўка падрыхтоўкі к з'езду паказвае, якой любоўю карыстаецца наша партыя сярод працоўных мас, якой любоўю карыстаецца правадыр нашай партыі тав. Сталін. Усё гэта дае ўпэўненасць, што наша партыя на чале з вялікім правадыром т. Сталіным і бліжэйшымі яго саратнікамі зможа [illegible] труднасці, якія на шляху будуць стаяць, пераможа і мы цвёрдымі крокамі пойдзем наперад па социялістычнаму шляху. (Бурныя апладысменты, пераходзячыя ў авацыю. Голас: «Няхай жыве тав. Сталін!» Крыкі: «Ура!» «Інтэрнацыянал»).

ДЗЕННІК З'ЕЗДА

Ранішняе пасяджэнне 20 студзеня 1934 года

Ранішняе пасяджэнне з'езда адкрывае тав. КОНІК. Прадаўжаюцца спрэчкі па дакладах т. т. ГІКАЛО і ЛЫЧОВА

Выступаўшыя таварышы яшчэ раз адзначылі агромадныя поспехі, з якімі наша партыя сустрэкае свой гістарычны з'езд.

Тав. ГАЛКОЎСКІ (Менск) адзначае дасягненні, з якімі прышла да XV з'езда Менская комсамольская арганізацыя. Улічыўшы ўказанні тав. Гікало, Менгарком ЛКСМБ паслаў на менскую ЦЭЦ 400 лепшых комсамольцаў. Створана шмат брыгад. Большасць з іх паказвае добрыя ўзоры барацьбы за выкананне вытворчых заданняў. Комсамолія БССР першая ў Совецкім Саюзе правяла ініцыятыву ў скліканні зпёраў маладых ударнікаў абароны. Гэты вопыт зараз распаўсюджан па ўсяму Совецкаму Саюзу. Вялікая работа праведзена па ачыстцы Менскай комсамольскай арганізацыі ад прымазаўшыхся класава-варожых элементаў. За час чысткі КП(б)Б з радоў Менская комсамола выключа на 186 чалавек.

Тав. ЛУНЧУК (Мазыр) завастрае ўвагу з'езда на слабым разгортванне партмасавай работы. Асабліва слаба працуюць на вёсцы парторгі.

Тав. ТУРЛАЙ (Полацак) падкрэслівае асабістую ролю т. Гікало ў справе выхоўвання партыйных кадраў, адзначае маналітнасць партыйнай арганізацыі Беларусі, адзінства яе радоў.

Гаворачы аб поспехах Полацкчыны, узорным выкананні с.-г. кампаніі, тав. Турлай падкрэслівае неабходнасць узмацнення ўвагі партарганізацыі далейшаму фарсаванню калгаснага будаўніцтва, і павышэнню культурнага ўзроўню калгасніка.

Тав. ГОРЫН (Акадэмія навук), гаворачы аб рабоце Акадэміі, падкрэслівае, што БелАН стала сапраўдным цэнтрам беларускай социялістычнай культуры. У сценах Акадэміі зараз працуюць звыш 100 комуністаў — навуковых работнікаў. Асабліва тав. Горын падкрэслівае неабходнасць сувязі Акадэміі з шырокімі працоўнымі масамі.

Тав. РУТЭНБЕРГ (нач. палітаддзела Заходняй дарогі) адзначае, што на транспарце асабліва адчуваецца слабасць арганізацыйнай работы. Працоўная дысцыпліна ў асобных звенях транспарта вельмі нізкая. Няма сістэматычнай праверкі выканання загадаў. Адчуваецца баязнь выпучаць на адказныя пасады новыя кадры.

Палітаддзел, — гаворыць тав. Рутэнберг, — правёў вялікую работу, асабліва па ачыстцы транспарту ад класава-варожых элементаў. У гэтым асабліва вялікарна роля тав. Гікало, які аказвае палітаддзелам сістэматычную дапамогу ў іх рабоце. У далейшай сваёй рабоце трэба зазарнуць увагу на перабудову парт масавай работы, на ўмацаванне нізавога транспартнага звяна.

Тав. БУРАЧЭЎСКІ (Дрыса) гаворыць аб дасягненнях, з якімі прышла да з'езда Дрысенская партыйная арганізацыя. Дрысенскі раён у 1933 годзе паказваў добрыя ўзоры ў выкананні сваіх абавязкаў перад дзяржавай. У гэтым вялікая заслуга Палітаддзела МТС.

Адзначаючы недахопы ў рабоце Дрысенскай партарганізацыі, тав. Бурачэўскі падкрэслівае слабы ход пра веркі выканання ўказанняў камісіі па чыстцы.

Тав. КОНЮХАЎ (начпадзіў Беларускай дывізіі) адзначае вялікую работу, праробленую ў галіне аўладання вайсковай тэхнікай, і поспехі ў палітычнай і баявой падрыхтоўцы чырвонаармейскага і каманднага складу.

Тав. АВЕРЫН (Віцебск) адзначае дрэнную работу наркаматаў, асабліва упэўнаркомцяжпрома, «Чырвоны металіст», — гаворыць тав. Аверын. — зараз знаходзіцца ў вельмі цяжкім становішчы. Між тым упэўнаркомцяжпром кітайскай сцяной адгароджан ад завода

Уся справа ў тым, што наркаматы не перабудавалі сваёй работы, не павярнуліся пасапраўднаму тварам да вытворчасці.

Тав. КРАЦЭР (Слуцак) зварачае ўвагу з'езда на тое, што Случчына ў свой час была пляцдзам контрэволюцыйнай нацдэмаўшчыны, работа якой была накіравана на зрыў мерапрыемстваў партыі. Аднак, пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б Слуцкая партыйная арганізацыя з поспехам выконвала пастаўленыя перад ёю задачы.

Тав. КАВАЛЬЧУК (ЦСПСБ) адзначае вялікую работу профсаюзаў, праведзеную ў час падрыхтоўкі да XV з'езда КП(б)Б. За гэты час узмацнілася ўдарніцтва, разгарнуўся ізотаўскі рух. Аднак, — гаворыць тав. Кавальчук, — за адставанне прамысловасці нясуць паўнейшую адказнасць таксама і профсаюзы. Як сярод гаспадарнікаў, так і профсаюзных работнікаў яшчэ ня знішчаны бюракратычныя метады кіраўніцтва.

Тав. Кавальчук падкрэслівае, што за час падрыхтоўкі да з'езда профсаюзамі праведзена значная работа ў галіне паляпшэння быту рабочых, але праведзеную работу пічыць дастатковай ні ў якім разе нельга.

Тав. БРАГІНСКІ («Звязда») зварачае ўвагу з'езда на неабходнасць узняцця ідэалагічнага ўзроўню работнікаў раённага партактыву.

Тав. ВАСІЛЬКОЎСКІ (нач. палітаддзела Віцебскага чыгуначнага раёна) падкрэслівае ўсё яшчэ дрэнную работу транспарта. Велізарныя здарэнні ёсць результат работы кла савага ворага. Шмат здарэнняў мае месца з-за тэхнічнай непадрыхтаванасці работнікаў транспарта, нізкай працоўнай дысцыпліны і наогул расхлябанасці, якая яшчэ існуе на транспарце.

Тав. Васількоўскі падкрэслівае спа бую дапамогу ў рабоце транспарта з боку тэратарыяльных арганізацый. З 18 тэратарыяльных арганізацый толькі адна — Віцебская партарганізацыя — сістэматычна аказвае дапамогу транспарту. Астатнія яшчэ не ўзяліся за выкананне пастановы ЦК КП(б)Б і СНК аб дапамозе транспарту ў яго рабоце.

Раніцняе пасяджэнне закончылася выступленнем тав. Галаўдзеда, якога спаткалі гучнымі воплескамі. У сваёй прамове т. Галаўдзед спыніўся на агрэмадных дасягненнях БССР, як неадлучнай часткі Сов

Тэзісы к 10-годдзю смерці В. І. Леніна

Ленін—вялікі асноваполажнік соцыялістычнага будаўніцтва

1. 21-га студзеня 1924 г. памёр Уладзімір Ільіч Ленін. 10 год аддзяляюць нас ад таго дня, калі адышоў ад нас найвялікшы геній нашай эпохі, настаўнік і правадыр міжнароднага пролетарыята і ўсяго працоўнага чалавецтва.

Калі Ленін пачаў сваю рэвалюцыйную барацьбу, капіталізм яшчэ толькі ўступаў у сваю апошнюю імперыялістычную стадыю. Цэнтр сусветнага рэвалюцыйнага руху перамяшчаўся ў Расію. У краіне памешчыцка-паліцэйскага самаволля, у глыбокім падполлі, у нястомнай барацьбе супроць усякіх дробна-буржуазных і буржуазных уплываў Ленін адбіраў, згуртоўваў і выхоўваў першую жменьку пролетарскіх рэвалюцыянераў, ядро будучай большавіцкай партыі. Ужо тады Ленін сваёй цвёрдай чоткасцю намеціў гістарычны шлях рабочага класа Расіі, яго «простую дарогу адкрытай палітычнай барацьбы» супроць царызма, супроць памешчыкаў і буржуазіі — дарогу «да пераможнай комуністычнай рэвалюцыі». [1]). Гэтыя прарочыя словы цалкам апраўдаліся яшчэ пры жыцці Леніна. У найвялікшых класавых баях новай эпохі, эпохі войн і рэвалюцыйных патрасенняў, Ленін ішоў на чале рэвалюцыйных мас. Ленінізм стаў сцягам мільёнаў. Ленін прекла́ў для РАБОЧАГА КЛАСА шляхі да знішчэння наёмнага рабства. Ён падняў пролетарыят усяго свету на штурм цвердынь імперыялізма, ён стварыў і ўзначаліў першую ў гісторыі дзяржаву пролетарскай дыктатуры. Ленін паказаў СЯЛЯНСТВУ, як пад кіраўніцтвам пролетарыяту горада вырвацца з цяжкіх поўпытоннацтва, з ліхаманкіх панчугу капітала, з цемры, забітасці і адзічэння. Ленін запаліў у прабуджаючыхся масах КАЛАНІЯЛЬНЫХ РАБОЎ усведамленне таго, што толькі рэвалюцыйнае паўстанне калоній у саюзе з рэвалюцыйным пролетарыятам Еўропы і Амерыкі назаўсёды вызваліць прыгнечаныя народы.

Неацэнімая спадчына, пакінутая нам Леніным. Ленін пакінуў нам рэвалюцыйную ТЭОРЫЮ, якую ён, прадаўжаючы справу Маркса і Энгельса, развіў у адпаведнасці з умовамі эпохі імперыялізма і пролетарскіх рэвалюцый і тым самым падняў марксізм на новую вышэйшую ступень. Ленін пакінуў нам большавіцкую ПАРТЫЮ, якую ён стварыў, правёў праз 3 рэвалюцыі і загартаваў у незлічоных баях. Ленін пакінуў нам КОМУНІСТЫЧНЫ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ, ідэйныя, тактычныя і арганізацыйныя асновы якога ён запаліў у бязлітоснай барацьбе з міжнародным меншэвізмам. Ленін пакінуў нам вялікі САЮЗ СОВЕЦКІХ СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РЭСПУБЛІК, які ён пабудаваў і адстаяў ад націску рускай і міжнароднай контррэвалюцыі. Ленін завяшчаў нам вялікі план ПАБУДОВЫ СОЦЫЯЛІЗМА. Ён залажыў краеугольныя камені СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ БУДОЎЛІ ў нашай краіне.

Ленін здабыў лютую нянавісць буржуазіі і бязмежную любоў працоўных. Ленін — сцяг барацьбы за пролетарскую рэвалюцыю, за дыктатуру пролетарыята, за комунізм. Імя Леніна пераможе вякі і тысячагоддзі.

2. Смерць Леніна выклікала піканне ў лагеры імперыялізмаў: яны не сумняваліся, што без Леніна пролетарская дыктатура загіне. Смерць Леніна акрыліла і тых, хто прабаваў звярнуць партыю з ленінскага шляху: яны думалі, што без Леніна ўдасца разбурыць ленінскую партыю.

Ворагі жорстка пралічыліся. Яны не ўлічылі таго, што Ленін упажыў у рукі сваёй партыі непераможную зброю сваёй бясстрашнай і ясной мысліі, зброю ленінізма. Ленін пасяліў у партыю сваю палкую нянавісць да буржуазнага ладу, сваю жалезную волю, накіраваную на разбурэнне гэтага ладу, на стварэнне комунізма. Ленін навучыў гэту партыю не баяцца труднасцей, не паддавацца стомленасці, суму, хістанням. Сцяг Леніна, сцяг партыі і Комінтэрна высока падняў і панёс далей СТАЛІН — лепшы сын большавіцкай партыі, дастойны пераемнік і вялікі прадаўжальнік справы Леніна.

10 год назад партыя вуснамі Сталіна дала клятву: «Трымаць высока і захоўваць у чыстаце вялікае званне члена партыі»; «Захоўваць адзінства нашай партыі, як зіцку вока»; «Захоўваць і ўмацоўваць дыктатуру пролетарыята»; «Умацоўваць усімі сіламі саюз рабочых і сялян»; «Умацоўваць і расшыраць Саюз Рэспублік»; «Расшыраць і ўмацоўваць саюз працоўных усяго свету — Комуністычны інтэрнацыянал» [2]).

Аглядаючыся на пройдзены дзесяцігадовы шлях, партыя ўправе запісаць, што сталінская клятва выканана з гонарам. ДЗЕСЯЦІГОДДЗЕ ПАСЛЯ СМЕРЦІ ЛЕНІНА — ДЗЕСЯЦІГОДДЗЕ ВЯЛІКАЙ СУСВЕТНА-ГІСТАРЫЧНАЙ ПЕРАМОГІ ЛЕНІНІЗМА. Пад кіраўніцтвам Сталіна большавікі дабіліся таго, што СОЦЫЯЛІЗМ У НАШАЙ КРАІНЕ ПЕРАМОГ.

[1]) Ленін. Твор, том І. стар. 194.

[2]) Сталін. «О Ленине», ИМЭЛ, 1934 г., стар. 19.

ПРОЛЕТАРСКАЯ РЭВОЛЮЦЫЯ, ДЫКТАТУРА ПРОЛЕТАРЫЯТА, КОМУНІЗМ

3. «Ленінізм ёсць тэорыя і тактыка ПРОЛЕТАРСКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ» (Сталін) [3]).

Маркс і Энгельс даказалі, што развіццё супярэчнасцей капіталізма немінучна вядзе да рэвалюцыйнага звяржэння буржуазіі, да дыктатуры пролетарыята, да комунізма. Ленін укрыў і дасведаваў асаблівасці імперыялізма, як апошняй стадыі капіталізма і паказаў, што «манаполія, якая вырастае з капіталізма, ёсць ужо ўмірання капіталізма» [4]).

Імперыялізм да апошняй мяжы абвастрыў усе супярэчнасці буржуазнага грамадства і падрыхтаваў глебу для рэвалюцыйнага ўзрыву. Эра пролетарскай рэвалюцыі НАЧАЛАСЯ. «Толькі пролетарская, соцыялістычная рэвалюцыя можа вывесці чалавецтва з тупіка, створанага імперыялізмам і імперыялістычнымі войнамі» [5]).

Апіраючыся на вопыт класавай барацьбы ва ўсім свеце, Ленін стварыў стратэгію і тактыку міжнароднай пролетарскай рэвалюцыі. Ён узброіў пролетарыят уменнем весці за сабой працоўныя масы горада і вёскі на розных этапах рэвалюцыйнай барацьбы; ён развіў ідэю перарастання буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў пролетарскую. Ён распрацаваў нацыянальна-каланіяльнае і аграрна-сялянская пытанні, як сустаўныя часткі агульнага пытання аб пролетарскай рэвалюцыі; ён даказаў, што «соцыяльная рэвалюцыя не можа адбыцца інакш, як у выглядзе эпохі, злучаючай грамадзянскую вайну пролетарыята з буржуазіяй у перадавых краінах і цэлы рад дэмакратычных і рэвалюцыйных, у тым ліку нацыянальна-вызваленчых рухаў у кіраўзітых, адсталых і прыгнечаных нацыях» [6]).

Ленін бязлітасна здзекаваўся над рэфармісцкімі бредамі аб магчымасці «мірнага» вырашэння супярэчнасцей буржуазнага грамадства, аб магчымасці безбалезнага «ўрастання» капіталізма ў соцыялізм. Адзінка магчымы шлях да перамогі пролетарскай рэвалюцыі — шлях узброенага паўстання, шлях грамадзянскай вайны.

Выходзячы з адкрытага ім закона нераўнамернасці капіталістычнага развіцця ў эпоху імперыялізма, Ленін паказаў, што пролетарская рэвалюцыя ёсць разрыў імперыялістычнага ланцуга ў яго слабейшых звеннях, што гістарычна магчыма і праўдападобна перамога пролетарскай рэвалюцыі ў адной краіне.

Гэта гістарычная магчымасць была расійскім пролетарыятам на чале з Леніным і партыяй большавікоў ператворана ў кастрычніку 1917 г. у сапраўднасць. Окцябрская рэвалюцыя — класічны ўзор прымянення на справе ленінскай тэорыі пролетарскай рэвалюцыі. Окцябрская рэвалюцыя — першы этап міжнароднай комуністычнай рэвалюцыі.

4. «Асноўным пытаннем ленінізма, яго адпраўным пунктам, яго фундаментам з'яўляецца пытанне аб дыктатуры пролетарыята» (Сталін) [7]).

Пераапрацаваўшы і крытычна абагуліўшы ўрокі Парыжскай комуны, урокі рускай і міжнароднай рэвалюцый, Ленін адкрыў дзяржаўную форму дыктатуры пролетарыята — СОВЕТЫ. Ленін узяў пад знішчальную крытыку буржуазную дэмакратыю, «дэмакратыю толькі для багатых», замаскаваную форму буржуазнай дыктатуры, «убранае для прапежніка самага звярскага, цынічнага» [8]). Наадварот, пролетарская дыктатура «жалезная ўлада рэвалюцыйная, смелая і быстрая» [9]), бязлітасная ў падаўленні класавага ворага, з'яўляецца ў той-жа час вышэйшым тыпам дэмакратыі — дэмакратыі ПРОЛЕТАРСКАЙ.

«Дыктатура пролетарыята ёсць ПРАЦЯГ класавай барацьбы пролетарыята Ў НОВЫХ формах. У гэтым стрыжань...» Дыктатура пролетарыята — «ЗБРОЯ пролетарыята ў класавай барацьбе», зброя падаўлення эксплаататараў, зброя адрыву непролетарскіх слаёў працоўных ад буржуазіі для сумеснай барацьбы супроць капіталізма, зброя арганізацыі соцыялістычнага грамадства. «МЫ ІДЗЕМ У БОЙ — ГЭТА ЁСЦЬ ЗМЕСТ ДЫКТАТУРЫ ПРОЛЕТАРЫЯТА. Прайшлі тыя часы ўтапічнага, наіўнага фантастычнага, механічнага, інтэлігенцкага соцыялізма, калі справу ўяўлялі так, што пераканаюць большасць людзей, нарысуюць прыгожы малюнак соцыялістычнага грамадства і стане большасць на пункт погляду соцыялізма... Да соцыялізма чалавецтва прыдзе НЕ ІНАКШ, ЯК ПРАЗ ДЫКТАТУРУ ПРОЛЕТАРЫЯТА» [10]).

Гэтыя словы былі расійскім пролетарыятам на чале з Леніным і партыяй большавікоў праведзены ў жыццё. СССР—класічны ўзор прымянення на справе ленінскага вучэння аб дыктатуры пролетарыята. СССР — першая цытадэль сусветнай пролетарскай дыктатуры.

5. На працягу стагоддзяў СОЦЫЯЛІЗМ аставаўся светлай, але недасяжнай марай. Маркс і Энгельс ператварылі бясспільную утопію ў непераможную навуку рэвалюцыйнага класа. Развіваючы і канкрэтызуючы гэту навуку, Ленін паставіў перад рабочым рухам ва ўвесь рост пытанне аб барацьбе за соцыялізм, як галоўную НЕАБХОДНУЮ задачу пролетарскай класавай барацьбы. Ленін даказаў, што наступіла эпоха, калі пролетарыят павінен выканаць сваю гістарычную місію — РАЗБУРЫЦЬ БУРЖУАЗНЫ ЛАД І СТВАРЫЦЬ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ ГРАМАДСТВА. Пролетарыят павінен знішчыць прыватную ўласнасць на сродкі вытворчасці, знішчыць глебу для эксплуатацыі чалавека чалавекам, назаўсёды знішчыць падзел на класы. Усё грамадства павінна складацца з работнікаў і кожны работнік павінен стрымліваць ад грамадства па сваёй працы. Пры соцыялізме змяшаюцца процілегласць паміж горадам і вёскай — «адна з самых глыбокіх асноў гаспадарчай і культурнай адсталасці вёскі» [11]). Соцыялізм стварае ўмовы для небывалага ў гісторыі чалавецтва развіцця прадукцыйных сіл, навукі, тэхнікі і культуры, для небывалага росквіту ўсіх творчых сіл і талантаў кожнай паасобнай індывідуальнасці.

Соцыялізм з'яўляецца першай фазай КОМУНІСТЫЧНАГА ГРАМАДСТВА, грамадства без класаў і без дзяржавы, грамадства «ЎСЕБАКОВА РАЗВІТЫХ І ЎСЕБАКОВА падрыхтаваных людзей, людзей, якія ЎМЕЮЦЬ УСЁ РАБІЦЬ» [12]), грамадства, на сцягу якога будзе напісана: ад кожнага па здольнасцях, кожнаму па патрэбнасцях.

Устанавіўшы сваю дыктатуру, расійскі пролетарыят на чале з Леніным і партыяй большавікоў упершыню ў гісторыі чалавецтва пачаў ПРАКТЫЧНА ажыццяўляць справу пабудовы соцыялізма.

6. У эпоху пролетарскай рэвалюцыі рабочаму класу для завалавання ўлады, для стварэння соцыялізма перш за ўсё неабходна кіраўніцтва ПАРТЫІ — «новай партыі, партыі баявой, партыі рэвалюцыйнай, даволі смелай для таго, каб павесці пролетарыяў на барацьбу за ўладу, даволі вопытнай для таго, каб разабрацца ў складаных умовах рэвалюцыйнай абстаноўкі і даволі гібкай для таго, каб абыйсці ўсе і ўсякія падводныя камяні на шляху да мэты... Новая партыя ёсць партыя ленінізма» (СТАЛІН) [13]).

Паводле Леніна дыктатура пролетарыята немыслима без партыі і, як вышэйшай формы класавай арганізацыі пролетарыята, без партыі, звязанай пры дапамозе прыводных пасаў з найшырэйшымі масамі рабочых і працоўных, без партыі, якая не падзяляе і не можа падзяляць ніраўніцтва з іншымі партыямі. Паводле Леніна, дыктатура пролетарыята немыслима без жалезнай дысцыпліны ў партыі, без суровай большавіцкай самакрытыкі, без няўхільнай барацьбы за адзінства партыі, супроць усякай фракцыйнасці і ўсякіх адступленняў ад большавіцкай лініі.

Шлях росту і ўмацавання партыі ленінізма ёсць шлях БАРАЦЬБЫ НА ДВА ФРОНТЫ. На кожным павароце класавай барацьбы, пакуль не вырваны самыя глыбокія карэні капіталізма, у рады пролетарскіх партый немінуча прасякаюць дробна-буржуазныя хістанні. Націск буржуазіі найбольш адкрыта адлюстроўвае ПРАВЫ апартунізм, які пад тым ці іншым прыкрыццём прапаведуе капітуляцыю перад буржуазіяй. За правым апартунізмам ідзе як цень апартунізм «левы» — «дробна-буржуазны рэвалюцыянізм, грозны, надуты, фанабарысты на словах, пустышка раздробленасці, распыленасці, безгаловасці на справе» [14]). Толькі такая партыя заслугоўвае імя ленінскай, у плоць і кроў якой увайшла непрымірымая варожасць Леніна да соцыял-дэмакратызма, да ўсіх ухілаў ад большавізма, да ўсякага прымірэнцтва.

Класічным узорам партыі новага тыпу з'яўляецца створаная Леніным ВКП(б). На тых-жа асновах пабудаван Леніным і КОМУНІСТЫЧНЫ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ, сусветная большэвіцкая партыя. Раўняючыся па свайму авангарду ВКП(б), нашы брацкія партыі на Захадзе і Ўсходзе ўпартэ змагаюцца за перамогу пролетарскай рэвалюцыі, дыктатуры пролетарыята, комунізма ва ўсім свеце.

Пролетарская партыя — «авангард пролетарыята, здольны ўзяць уладу і ВЕСЦІ ЎВЕСЬ НАРОД ДА СОЦЫЯЛІЗМА, накіроўваць і арганізоўваць новы лад, быць настаўнікам, кіраўніком, правадыром усіх працоўных і эксплуатуемых у справе ўстройства свайго грамадзкага жыцця БЕЗ БУРЖУАЗІІ І СУПРОЦЬ БУРЖУАЗІІ» [15]).

[11]) Ленін. Творы, том 24, стар. 107.

[12]) Ленін. Творы, том 25, стар. 195.

[13]) Сталін. «Вопросы ленинизма, 9-е выданне, стар 64-65.

[14]) Ленін. Творы, том 27, стар. 5.

[15]) Ленін. Творы, том 21, стар. 386.

ЛЕНІНСКІ ПЛАН ПАБУДОВЫ СОЦЫЯЛІЗМА Ў НАШАЙ КРАІНЕ

7. Ленін навукова ўгрунтаваў МАГЧЫМАСЦЬ ПАБУДОВЫ ПОЎНАГА СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ГРАМАДСТВА Ў АДНОЙ КРАІНЕ. «Развіццё капіталізма адбываецца ў вышэйшай ступені нераўнамерна ў розных краінах... Адсюль няўхільны вывад: соцыялізм не можа перамагчы адначасова ва ўсіх краінах. Ён пераможа спачатку ў адной ці некалькіх краінах, а астатнія на працягу некаторага часу астануцца буржуазнымі ці дабуржуазнымі» [16]). Пад перамогай соцыялізма ў адной краіне Ленін разумеў не толькі захват дзяржаўнай улады пролетарыятам «адной, асобна ўзятай капіталістычнай краіны», але і арганізацыю ім соцыялістычнай вытворчасці. «Перамогшы пролетарыят гэтай краіны, экспрапрыяваўшы капіталістаў і арганізаваўшы ў сябе соцыялістычную вытворчасць, устаў-бы супроць астатняга капіталістычнага свету, прыцягваючы да сябе прыгнечаныя класы іншых краін, падымаючы ў іх паўстанне супроць капіталістаў, выступаючы ў выпадку неабходнасці нават з ваеннай сілай супроць эксплаататарскіх класаў і іх дзяржаў» [17]). Ленін пічыў зусім ажыццёўнай пабудову соцыялізма ў РАСІІ, якая прадстаўляла сабой хоць і параўнаўча адсталую краіну, але краіну імперыялістычную, якая мела буйную прамысловасць і загартаваны пролетарыят, кіруемы самай рэвалюцыйнай у свеце партыяй.

Ідэя магчымасці пабудовы соцыялістычнага грамадства ў нашай краіне, высукутая Леніным у гады імперыялістычнай вайны, пяхыць у АСНОВЕ ўсёй ленінскай палітыкі пасля Окцябрскай перамогі. Гэту цэнтральную ідэю Ленін нязмэна адстойваў на ЎСІХ этапах развіцця совецкай рэспублікі. У 1918 г., у найцяжэйшыя дні Брэста, Ленін гаварыў, што для стварэння «магутнасці ваеннай і магутнасці соцыялістычнай» «у нас ёсць матэрыял і ў прыводных багацтвах, і ў запасе чалавечых сіл, і ў бліскучым размаху, які дала народная творчасці вялікая рэвалюцыя» [18]). У 1919 г., калі совецкая рэспубліка была ў кальцы благвардзейцаў і інтэрвентаў, Ленін пісаў: «Буржуазія ўсяго свету імкнена таму вар'яцее і лютуе супроць большэвізма, арганізуе ваенныя напады і змовы і іншае супроць большэвікоў, што яна вельмі добра разумее НЕМІНУЧАСЦЬ НАШАЙ ПЕРАМОГІ Ў ПЕРАБУДОВЕ ГРАМАДСКАЙ ГАСПАДАРКІ, калі нас не задавіць ваенны сілай» [19]). Рабочыя масы «ведаюць, што яны самі ўзнесці рукой будуюць соцыялізм..., І НІЯКАЯ СІЛА ЎНУТРЫ КРАІНЫ НЕ ПЕРАШКОДЗІЦЬ ДАВЕСЦІ ГЭТУ СПРАВУ ДА КАНЦА» [20]). У 1922 г., падводзячы першыя вынікі гаспадарчага ўздыму на рэйках непа, Ленін выказваў найглыбейшую ўпэўненасць у тым, што «Расія нэпаўская» ператворыцца «ў Расію соцыялістычную». Нарэшце, у 1923 г. Ленін з вычэрпальнай пайнатай указаў, што «ДЛЯ ПАБУДОВЫ ПОЎНАГА СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ГРАМАДСТВА» ў нас, у совецкай рэспубліцы, ёсць «УСЁ НЕАБХОДНАЕ І ДАСТАТКОВАЕ» [21]).

8. Ленін стварыў грандыёзны ПЛАН рэарганізацыі ўсёй гаспадаркі краіны на соцыялістычных асновах. Перад пролетарыятам была пастаўлена нечуваная ў гісторыі, небывалая па смеласці, шырыні і цэннасці замыслу і ў той-жа час зусім навуковая і наскрозь канкрэтная задача ў 10-20 ГОД змяніць твар гігантыкай краіны, у корані перарабіць яе эканамічны ўклад, ПАБУДАВАЦЬ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ ГРАМАДСТВА.

Асноўныя звенні ленінскага плана: аўладаць КАМАНДНЫМІ ВЫШЫНЯМІ ў эканоміцы краіны, нацыяналізаваць зямлю, буйную прамысловасць, транспарт, банкі, замежны гандаль; падвесці пад прамысловасць, транспарт, сельскую гаспадарку базу сучаснай перадавой ТЭХНІКІ; развіць магутную соцыялістычную ПРАМЫСЛОВАСЦЬ, здольную тэхнічна пераўзброіць усю гаспадарку краіны; кааперываць сялянства, ператварыць дробную, распыленую і адсталую СЕЛЬСКУЮ ГАСПАДАРКУ ў буйную калектыўную гаспадарку; адцясніць і знішчыць капіталістычныя элементы ў нашай краіне, пабудаваць ФУНДАМЕНТ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЭКАНОМІКІ; дабіцца эканамічнай незалежнасці совецкай краіны ад капіталістычнага свету; стварыць ваенную магутнасць соцыялістычнай рэспублікі, забяспечыць яе АБАРОНАЗДОЛЬНАСЦЬ; ДАГНАЦЬ І ПЕРАГНАЦЬ у тэхнічных і эканамічных адносінах перадавыя буржуазныя краіны.

Ленін разглядаў барацьбу за ажыццяўленне гэтага плана, як сустаўную частку і рашаючы фронт СУСВЕТНАЙ ПРОЛЕТАРСКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ. Тактыку большэвікоў, праводзячых «максімум ажыццявімага ў адной краіне для развіцця, падтрымання, абуджэння рэвалюцыі ва ўсіх краінах», Ленін называў «АДЗІНА ІНТЭРНАЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ» [22]) тактыкай. Кожную перамогу на фронце гаспадарчага будаўніцтва ў совецкай краіне Ленін разглядаў як магутнае падтрымання рэвалюцыйнага руху на Захадзе і Ўсходзе. «У Расіі вырашэцца пёс не рускага толькі, а і міжнароднага капітала». Рабочыя масы ўсіх краін ведаюць, што ТУТ, У РАСІІ, вырашэцца пёс агульнай сусветнай рэвалюцыі» [23]).

Для перамогшага пролетарыята любой капіталістычнай краіны ленінскі план пабудовы соцыялізма будзе служыць рашаючай дырэктывай, а соцыялістычнае будаўніцтва ў СССР — прыкладам і ўзорам. Ленін прадбачыў, што «калі Расія пакрыецца густой сеткай электрычных станцый і магутных тэхнічных абсталяванняў, дым наша комуністычная гаспадарка стане УЗОРАМ ДЛЯ БУДУЧАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ Еўропы і Азіі» [24]).

9. Ленін вучыў, што няма іншага шляху пабудовы соцыялізма, апрача КЛАСАВАЙ БАРАЦЬБЫ: няма другой сілы, апрача ПРОЛЕТАРЫЯТА, здольнай перафармаваць усю эканоміку краіны, пераварыць глебу так, «каб на ёй зусім не магла расці ніякая буржуазія» [25]); няма іншай зброі ў пролетарыята ў яго барацьбе за пабудову соцыялізма, апрача ПРОЛЕТАРСКАЙ ДЫКТАТУРЫ.

Ключом да перамогі соцыялістычнага плана Ленін пічыў упартую, настойлівую, паслядоўную, гераічкі смелую барацьбу партыі кіруючай і напраўляючай сілы ва ўсёй сістэме пролетарскай дыктатуры, ПАРТЫІ, умеючай на кожным этапе знайсці важнейшае звяно, высунуць, цэнтральную задачу, вырашэнне якой адкрывае шлях наперад, на новую і вышэйшую ступень.

«Уся работа партыі ідзе праз СОВЕТЫ» [26]). Шлях да соцыялізма ёсць шлях УМАЦАВАННЯ ПРОЛЕТАРСКАЙ ДЫКТАТУРЫ, шлях пагалоўнага ўцягнення працоўных у справу кіраўніцтва дзяржавай, шлях шчэпкай барацьбы з бюракратызмам ва ўсіх звенках совецкага апарата.

«Партыя непасрэдна апіраецца ў сваёй рабоце на ПРАФЕСІЯНАЛЬНЫЯ САЮЗЫ». Ленін пічыў прафсаюзы «крыніцай, з якой бярэцца ўся наша ўлада». «Будучы школай комунізма наогул, профсаюзы павінны быць, у прыватнасці, школай кіраўніцтва соцыялістычнай прамысловасцю (а затым паступова і земляробствам) для ўсёй масы рабочых, а затым і для ўсіх працоўных» [27]).

Ленін даў разгорнутую праграму ўцягнення РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ ў справу пабудовы соцыялізма; комсамол павінен стаць ударнай групай, якая ва ўсякай рабоце аказ ае сваю дапамогу, прваўлае сваю ініцыятыву, свой пачын» [28]). Велізарнае месца ў соцыялістычным будаўніцтве Ленін адводзіў ГРАЦОЎНАЙ ЖАНЧЫНЕ; Ленін пічыў, што «пачатая совецкай уладай справа можа быць рушана напарад толькі тады, калі замест соцень жанчын па ўсёй Расіі ў ёй прымуць удзел мільёны і мільёны жанчын... Тады соцыялістычнае будаўніцтва будзе стаяць у Расіі так моцна, што ніякія знешнія ворагі ў іншых краінах і ўнутры Расіі не будуць совецкай рэспубліцы страшны» [29]).

10. Ленін паказаў, што пабудаваць соцыялізм — значыць перш за ўсё вырашыць пытанне «ХТО КАГО». «Соцыялізма нельга ўвесці»... «ЁН ВЫРАСТАЕ Ў ХОДЗЕ САМАЙ НАПРУЖАНАЙ, САМАЙ ВОСТРАЙ ДА ШАЛЕНСТВА, ДА РОСПАЧЫ ВОСТРАЙ КЛАСАВАЙ БАРАЦЬБЫ» [30]).

Усю моц сваёй дыктатуры пролетарыят, які стаіць на чале ўлады, скарыстоўвае для таго, каб ПАДАЎЛЯЦЬ СУПРАЦЎЛЕННЕ ЭКСПЛААТАТАРАЎ, якое становіцца тым больш адчайным і жорсткім, чым бліжэй падходзіць пролетарыят да ажыццяўлення сваёй асноўнай задачы знішчэння класаў.

Вышэйшы прынцып дыктатуры пролетарыята — САЮЗ РАБОЧАГА КЛАСА З СЯЛЯНСТВАМ пад кіраўніцтвам рабочага класа. Палітыку пролетарскай дыктатуры ў вёсцы Ленін выразіў у трыадзінай формуле: «Умець дасягаць пагаднення з сярэднім селянінам, ні на мінуту не адмаўляючыся ад барацьбы з кулаком і моцна апіраючыся толькі на беднату» [31]). Ленін гаварыў, што змычка рабочага класа з сялянствам забяспечвае паспяховы рух да соцыялізма толькі пры ўмове цвёрдага і паслядоўнага пролетарскага кіраўніцтва. Што гэта значыць — кіраваць сялянствам? Гэта значыць... «ВЕСЦІ ЛІНІЮ НА ЗНІШЧЭННЕ КЛАСАЎ, А НЕ НА ДРОБНАГА ВЫТВОРЦУ» [32]).

Класавая барацьба ў эпоху пабудовы соцыялізма заключаецца і ў разшучай барацьбе супроць дэзарганізатараў працы, супроць подыраў, разчоў, дармаедаў, жулікаў, супроць ПРАВАДНІКОЎ УПЛЫВУ КЛАСАВАГА ВОРАГА Ў АСЯРОДЗІШЧЫ САМОГА РАБОЧАГА КЛАСА.

11. Заваяваўшы ў кастрычніку 1917 г. сваю дыктатуру, пролетарыят тым самым стварыў АСНОЎНУЮ прадпасылку соцыялістычнага будаўніцтва. Пад кіраўніцтвам Леніна совецкая дзяржава нацыяналізавала зямлю, экспрапрыявала буйную буржуазію, узяла ў свае рукі банкі, транспарт, буйную прамысловасць і гандаль, устанавіла манаполію замежнага гандлю. Цачой Брэсцкага міра Ленін дабіўся ПЕРАДЫШКІ і для гаспадарчага будаўніцтва. Але перадышка была не доўгая. Краіну Советаў апаясалі ФРАНТЫ. Рукамі інтэрвентаў і белых генералаў сусветны капіталізм на працягу 3-х год прабаваў задушыць, утапіць у крыві совецкую рэспубліку. Пролетарская дзяржава кінула ўсе сілы на фронт і вымушана была ўвесці палітыку «ваеннага комунізма». Не гледзячы на недахват хлеба і зброі, на нецахват вопыта і арганізацыі, на голад, разруху і кулацкія паўстанні ў тылу, створаная Леніным Рабоча-Сялянская Чырвоная армія была пераможнай на ўсіх франтах ад Архангельска і Одэсы да Владзівастока.

Адстаяўшы ў грамадзянскай вайне мірную соцыялістычную працу, пролетарская дзяржава абвясціла ў пачатку 1921 г. НОВУЮ ЭКАНАМІЧНУЮ ПАЛІТЫКУ. Гэта геніяльна задуманая Леніным і ўведзеная яго цвёрдай рукой палітыка ў асноўных рысах прадаўжала на новым і вышэйшым этапе барацьбы эканамічную палітыку перыяда першай перадышкі. «Эканамічна і палітычна НЭП цалкам забяспечвае нам магчымасць пабудовы фундамента соцыялістычнай эканомікі» [33]).

Замена харчразвёрсткі харчпадаткам і аднаўлянне рынка вялі да падёму сельскай гаспадаркі, стварылі ўмовы для развіцця прамысловасці, умацнення саюз паміж рабочым класам і асноўнымі масамі сялянства. Увядзенне нэпа азначала таксама адраджэнне і часовае развіццё прыватна-гаспадарчага капіталізма. Але пасля вымушанага адступлення і перагрупоўкі сіл пачалося павольнае, няўхільнае, паступова паскараўшаеся НАСТУПЛЕННЕ сацыялізма. «Мы цяпер робім стратэгічнае адступленне, якое дасць нам больш шырокі фронт наступлення ў бліжэйшым будучым. Дасць эканамічную мацнейшую змычку з мільёнамі дробных сялян, з мэсай сялянства, зробіць наш саюз, саюз рабочых і сялян, аснову ўсёй нашай совецкай рэвалюцыі, усёй нашай совецкай рэспубліцы непераможным» [34]).

Уся барацьба большэвіцкай партыі за рэалізацыю ленінскага плана з 1921 г. працякае НА РЭЙКАХ НЭПА. «Нэп ёсць асобая палітыка пролетарскай дзяржавы, разлічаная на дапушчэнне капіталізма пры наяўнасці камандных вышынь у руках пролетарскай дзяржавы, разлічаная на барацьбу элементаў капіталістычных і соцыялістычных, разлічаная на ўзрастанне ролі соцыялістычных элементаў на шкоду элементам капіталістычным, разлічаная на перамогу соцыялістычных элементаў над капіталістычнымі, разлічаная на знішчэнне класаў, на пабудову фундамента соцыялістычнай эканомікі» (СТАЛІН). [35]).

12. Ленінскі курс на перамогу соцыялізма ў нашай краіне быў мішэнню бесперапынных атак з боку ЎНУТРЫПАРТЫЙНЫХ АПАЗІЦЫЙ, адлюстроўваўшых націск дробна-буржуазнай стыхіі. У аснове ЎСІХ гэтых антыбольшэвіцкіх плыняй пяжала адмаўленне соцыялістычнага характара Окцябрскай рэвалюцыі, нявер'е ў здольнасць пролетарыята ўмацаваць сваю дыктатуру, утрымаць пад сваім кіраўніцтвам сялянства і разам з ім будаваць соцыялізм.

Ленін неўмаліма ўскрываў дробна-буржуазную прыроду ўсіх антыпартыйных ухілаў. На кожным этапе рэвалюцыі на чале з Леніным партыя адкідала са свайго шляху панікёраў і дэзарганізатараў, цягнуўшых партыю на шлях буржуазнай дэмакратыі (меншэвіцтвуючыя дэзертыры Окцябра); гатовых у імя мнімарэвалюцыйнай фразы пайсці на ўтрату совецкай улады («левыя комуністы»); зводзіўшых на нішто кіруючую ролю партыі ў пролетарскай дзяржаве (сапронаўцы); абстрэльваўшых партыю з анарха-сіндыкалісцкіх і трэд'юніяністкіх пазіцый (шляпнікаўцы); прабаваўшых з розных канцоў расхістаць сістэму пролетарскай дыктатуры і паставіць пад сумненне асновы ленінскай палітыкі (Троцкі).

Ленін заўсёды прымяняў самыя крутыя метады барацьбы супроць ворагаў партыйнага адзінства, супроць правых і «левых» штрэйкбрэхераў соцыялістычнага будаўніцтва. Ленін патрабаваў «жалезнай дысцыпліны і да канца праведзенай дыктатуры пролетарыята супроць дробна-буржуазных хістанняў» [36]). На X і XI з'ездах РКП(б) у сувязі з паваротам партыі да задач соцыялістычнага будаўніцтва на рэйках нэпа Ленін з асаблівай сілай папярэдзіў партыю аб неабходнасці безумоўнага і найстражэйшага адзінства яе радоў і поўнага знішчэння ўсякай фракцыйнасці. «Ёсць рэчы, якімі жартаваць не дазваляецца; ёсць такія рэчы, як адзінства партыі» [37]).

13. Ажыццяўленне вялікай ленінскай праграмы пабудовы соцыялізма прадбачыла ўсё большае ўзмацненне планавага прынцыпу ў нашай гаспадаркі, усё большае ўздзеянне пролетарскай дыктатуры на ўвесь ход гаспадарчага жыцця краіны. Ленін упершыню паставіў перад партыяй задачу выпрацоўкі канкрэтных ВЫТВОРЧЫХ ПЛАНАЎ, рэалізуемых у пэўныя адрэзкі часу. «Нельга працаваць, не маючы плана, разлічанага на доўгі перыяд і на сур'ёзны поспех» [38]).

Першым плянам тэхнічнай і эканамічнай рэканструкцыі нашай гаспадаркі быў вядомы ленінскі план Гоэлро. У аснове гэтага першага народна-гаспадарчага плана, правобразя нашых пяцігодак, ляжала ідэя падвядзення пад усю гаспадарку краіны НОВАЙ ТЭХНІЧНАЙ БАЗЫ. «Мы Расію павінны паставіць і можам паставіць на іншую базу» [39]). Такой новай вышэйшага тыпу тэхнічнай базай з'яўляецца электрычнасць. «Комунізм — гэта ёсць совецкая ўлада плюс электрыфікацыя краіны... Толькі тады, калі краіна будзе электрыфікавана, калі пад прамысловасць, сельскую гаспадарку і транспарт будзе падведзена тэхнічная база сучаснай буйнай прамысловасці, толькі тады мы пераможам канчаткова» [40]).

Сталін тады-ж, у сакавіку 1921 г., у пісьме к Леніну ахарактарызаваў план Гоэлро, як «майстэрскі накід сапраўды адзінага і сапраўды дзяржаўнага гаспадарчага плана без дакласаў», як «адзіную ў наш час марксісцкую спробу падвядзення пад совецкую надбудову гаспадарча-адсталай Расіі сапраўды рэальнай і адзіна магчымай пры цяперашніх умовах тэхнічна-вытворчай базы» [41]).

14. «Адзіна магчымай эканамічнай асновай соцыялізма з'яўляецца БУЙНАЯ МАШЫННАЯ ІНДУСТРЫЯ» [42]).

Магутная соцыялістычная прамысловасць з'яўляецца галоўнай прадпасылкай ігантыцкага развіцця прадукцыйных сіл, перабудовы дробнай сельскай гасп

ЭЗАЛЮЦЫЯ МАСКОУСКАЙ АБ'ЯДНАНАЙ IV АБЛАСНОЙ і III ГАРАДСКОЙ ПАРТКАНФЕРЭНЦЫІ ПА ДАКЛАДУ тав. КАГАНОВІЧА АБ РАБОЦЕ ЦК ВКП(б)

слухаўшы даклад тав. Л. М. Кагановіча аб рабоце ЦК ВКП(б) за перыяд ад XVI да XVII з'езда Маскоў скай аб'яднанай (IV абласная і III гарадская партыйная канферэнцыя ЛКСМ і поўнасцю ўхваляе палітычную лінію і практычную дзейнасць Цэнтральнага Камітэта ВКП(б).

I.

Канферэнцыя адзначае, што за час паміж XVI і XVII з'ездамі партыі цалкам і поўнасцю пацверджана ацэнка міжнароднага становішча, даная тав. Сталіным на XVI з'ездзе.

Усветны эканамічны крызіс, які абвастрае ва ўмовах усеагульнага крызісу капіталізма, панёс руйнавальныя ўдары і расхістаў эканамічную сістэму капіталізма, сарваў яго часовую стабілізацыю, выкінуў на вуліцу мільёны рабочых і збяднелых сялян.

Не гледзячы на тое, што за апошнім часам у радзе краін выявілася магчымасць і нават праўдападобнасць выходу з хістаннямі ўверх і ўніз з глыбокага крызіса да дэпрэсіі — агульны крызіс капіталістычнай сістэмы ўсё больш абвастраецца, насцілаючы ўмовы прадпасылкі рэвалюцыйнага крызіса, і капіталізм усё больш падыходзіць да новага тура рэвалюцый і войн.

Гэта справаздачны перыяд цалкам пацвердзіліся ўказанні тав. Сталіна на XVI з'ездзе аб тым, што «буржуазія будзе шукаць выхада са становішча ў далейшай фашызацыі ўнутранай палітыкі, скарыстоўваючы для гэтага ўсе рэакцыйныя сілы, у тым ліку і сацыял-дэмакратыю» і «ў новай імперыялістычнай вайне і інтэрвенцыі ў галоўнай знешняй палітыкі».

Прыход да ўлады фашыстаў у Германіі і рост фашызма ў радзе іншых краін з'яўляецца рэзультатам буржуазнай дзейнасці галоўнай сацыяльнай апоры буржуазіі — міжнароднай сацыял-дэмакратыі, перажываючай найглыбейшы распад і крызіс.

Шчыльна перабудоўваюцца імперыялістычныя блокі, заключаюцца новыя саюзы і згоды, ліхаманкава працуюць генеральныя штабы і ваенныя заводы. Зарава імперыялістычных вайны ўсё больш разгараецца на Далёкім Усходзе, дзе японская фашыстка бесталкарана грабіць мноства багатых кітайскіх народ, прадаючы Японіі, рыхтуе плацдарм для нападу на Совецкі Саюз.

Толькі краіна пролетарскай дыктатуры, кіруемая ленінскім ЦК, развіваецца на магутны індустрыяльны ўздым усёй народнай гаспадаркі, на сілы Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі, вядзе цвёрдую, мудрую, паслядоўную і рашучую палітыку міра і барацьбу супроць войн і інтэрвенцыі.

Канферэнцыя вітае бліскучыя перамогі знешняй палітыкі ленінскага ЦК і тав. Сталіна, якія выявіліся ў заключэнні раду пактаў аб ненападзенні, у мудрым скарыстанні супярэчнасцяй у лагеры імперыялістаў і ўстанаўленні пармальных адносін паміж Совецкім Саюзам і ПАЗШ.

Цэнтральны Камітэт, адстойваючы на выключнай сілай і голасцю інтарэсы вялікай краіны пролетарскай дыктатуры, дабіўся таго, што Совецкі Саюз стаў рашаючым фактарам міжнароднага жыцця і палітыкі. Палітыка ЦК знаходзіць магутнае падтрыманне ўсіх рабочых і працоўных мас краіны, усяляе ў іх пачуццё гордасці і ўпэўненасці за кожны крок сваёй партыі і яе правадыра тав. Сталіна. Перад тварам наглай правакацыі германскіх фашыстаў і японскай ваеншчыны маскоўскія большэвікі заяўляюць, што рабочыя і працоўныя нашай краіны, якая вядзе неаслабную палітыку міра, адлеюць паказаць ворагу сілу і магутнасць вялікай Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі. Тых імперыялістаў, якія напрабуюць пасягнуць хоць-бы на адну пядзь совецкай зямлі, чакае поўны разгром.

Канферэнцыя заклікае рабочых, калгаснікаў і працоўных яшчэ больш мацаваць абароназдольнасць рабоча-сялянскай дзяржавы. На правакацыі германскіх фашыстаў і японскай ваеншчыны адказаць ператварэннем кожнага завода, соўгаса і калгаса ў непрыступную крэпасць пролетарскай рэвалюцыі.

II.

На XVI з'ездзе ВКП(б) цвёрдай рукой Сталіна быў нацэлены вялікі план разгорнутага наступлення сацыялізма па ўсяму фронту. Правільная ленінская палітыка, штодзённае канкрэтнае кіраўніцтва Цэнтральнага Камітэта забяспечылі найвялікшыя перамогі сацыялізма ў СССР. 3½ гады, якія аддзяляюць нас ад XVI з'езда, з'яўляюцца вялікай гістарычнай эпохай пераможнай барацьбы рабочых і сялян пад кіраўніцтвам партыі, пад кіраўніцтвам тав. Сталіна — супроць ворагаў народа, за перамогу ленінскай палітыкі.

У рэзультаце напружанай, паспяховай барацьбы з класавымі ворагамі і апартуністамі, пры небывалым удзеле актыўнасці мільённых мас рабочых і сялян, пры непахісным сталінскім кіраўніцтве, разгорнутым наступленнем па ўсяму фронту наша партыя дабілася сапраўды сусветна-гістарычных перамог па перабудове нашай краіны.

За перыяд паміж XVI і XVII з'ездамі партыі Совецкі Саюз вышаў у першыя рады самых перадавых у тэхніка-эканамічных адносінах краін, ператварыўся ў краіну неабсалютна ад капрызаў капіталізма, краіну з магутнай сучаснай тэхнікай абароны, краіну, якая мае ўласную базу для поўнага завяршэння ў другім пяцігодзі тэхнічнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі.

На базе індустрыялізацыі, калгаснага і соўгаснага будаўніцтва. Совецкі Саюз ператварыўся ў краіну самага буйнага ў свеце землятрабства. Рабочы клас вырашыў самую трудную задачу пролетарскай рэвалюцыі — сацыялістычную перабудову сялянства — і вывеў раней адсталыя і эксплаатуемыя масы сялян на шлях светлага, культурнага, заможнага жыцця. Датэрміновае выкананне плана хлебапаставак у 1933 годзе, рост матэрыяльна-культурнага ўзроўню калгаснікаў — лепшы доказ перамогі калгаснага ладу.

У жорсткай класавай барацьбе, умацоўваючы пазіцыі сацыялізма, наш ЦК дабіўся карэнных змен у расстаноўцы класавых сіл у краіне на карысць сацыялізма. Як ніколі колькасна вырасла і яскрава ўмацавалася рады рабочага класа. Мільённыя масы беднякоў і сярэднякоў, аб'яднаўшыся ў калгасы, складаюць моцную апору совецкай улады ў вёсцы. У асноўным ліквідаваны апошні эксплуататарскі клас — кулацтва. Калгасны лад рашуча перамог. Партыя разграміла спробы кулацкіх недабіткаў арганізаваць сабатаж хлебазагатовак, арганізаваць раскрадванне сацыялістычнай уласнасці, згнутры паладраць калгасы. Як ніколі ўмацаваўся саюз рабочага класа з сялянствам; як ніколі ўзрасла, умацавалася кіруючая роля рабочага класа і нашай ленінскай партыі.

Высока падняўся матэрыяльны і культурны ўзровень рабочых і калгаснікаў. Поўнасцю і назаўсёды пакончана з праклятай спадчынай капіталізма — беспрацоўем, назаўсёды пакончана з збяднеццем і галечай мільённых мас сялянства. СССР усё больш ператвараецца ў краіну перадавой сацыялістычнай культуры, у краіну роскіту навуковай і тэхнічнай думкі. Сотні новых вытворчасцяй абслугоўваюцца новапад рыхтаванымі кваліфікаванымі паву кова-тэхнічнымі кадрамі з асяродзішча рабочых. «Упэўнена і радасна глядзіць кожны рабочы і калгаснік на сваё будучае, прадугадваючы ўсё больш павышаныя запатрабаванні да ведаў, культуры» (тэзісы к дакладу т. т. Молатава і Куйбышава аб другім пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі СССР). У жорсткай барацьбе з ворагамі ленінізма, за генеральную лінію партыі, апіраючыся на актыўнасць найшырэйшых мас рабочых і сялян, наш ЦК пад кіраўніцтвам тав. Сталіна прывёў краіну к XVII з'езду з буйнейшымі перамогамі на ўсіх франтах сацыялістычнага будаўніцтва.

Рэвалюцыйным вопытам мільёнаў рабочых і сялян за гэтыя гады даказана і пацверджана гістарычная праўда і сіла ленінскай тэорыі перамогі сацыялізма ў нашай краіне, тэорыю, якую адстаяў, развіў і ка крэтызаваў у барацьбе з трацкістамі і правымі апартуністамі наш правадыр, настаўнік і арганізатар перамог сацыялізма — тав. **Сталін.**

III.

Канферэнцыя горача вітае апублікаваныя тэзісы т. т. Молатава, Куйбышава і Кагановіча, ухваленыя ў асноўным Палітбюро ЦК, к XVII з'езду партыі, тэзісы, якія ўзбройваюць рабочы клас і працоўныя масы ясным перспектывай і канкрэтнай праграмай другой пяцігодкі, праграмай ліквідацыі капіталістычных элементаў і класаў наогул і ператварэння Совецкага Саюза ў самую магутную ў тэхнічных адносінах краіну ў Еўропе.

Выкананне гэтай праграмы прадбачыць завяршэнне тэхнічнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі, рашаючай умовай якога павінна з'явіцца асваенне новай тэхнікі і новых вытворчасцяй. Канферэнцыя заклікае ўсю Маскоўскую арганізацыю дабіцца таго, каб маскоўскія рабочыя, работніцы і калгаснікі ішлі ў авангардзе барацьбы за асваенне тэхнікі. Канферэнцыя абавязвае маскоўскіх большэвікоў сканцэнтраваць усю сваю ўвагу на поўным выкананні народна-гаспадарчага плана 1934 г., на рашучым паляпшэнні якасці прадукцыі.

Цалкам ухваляючы велізарную будаўнічую праграму ў другой пяцігодцы, праграму росту больш чым у два разы сельска-гаспадарчай прадукцыі, канферэнцыя асабліва адзначае атрамадныя маштабы намечанай праграмы павышэння матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця рабочых і сялян. Канферэнцыя падкрэслівае выключнае значэнне для народнай гаспадаркі разгортвання тавараварота паміж горадам і вёскай і ўзмацнення ўсіх відаў транспарта, асабліва чыгуначнага, і абавязвае Маскоўскі камітэт дабіцца рашаючых зрухаў у гэтай галіне.

Барацьба за выкананне плана другой пяцігодкі патрабуе далейшай перабудовы работы ўсіх органаў пролетарскай дыктатуры.

На аснове канкрэтнага кіраўніцтва ленінскага ЦК, спалучыўшага ва ўсёй сваёй штодзённай дзейнасці высокую прынцыповасць і большэвіцкі рэвалюцыйны размах з увагай да ўсіх дэталяй арганізацыйна-практычнай работы, партыя за апошнія гады правяла сур'ёзныя меры па паляпшэнню і перабудове работы совецкіх, гаспадарчых і партыйных арганізацый (перабудова Донбаса, стварэнне палітаддзелаў, разузбуйнення, чыстка і скарачэнне дзяржапарата, чыстка партыі і т. д.).

У поўнай згодзе з тэзісамі к дакладу т. Кагановіча, ухваленымі ў асноўным Палітбюро ЦК, канферэнцыя падкрэслівае неабходнасць разгарнуць энергічную і ўпартую барацьбу за неадкладную ліквідацыю адставання практыкі арганізацыйнай работы совецкіх, гаспадарчых, профсаюзных і партыйных арганізацый ад патрабаванняў палітычнай лініі партыі.

Канферэнцыя заклікае ўсіх членаў маскоўскай арганізацыі павесці рашучую барацьбу з канцылярска бюракратычнымі метадамі кіраўніцтва, з работай метадам «агульных дырэктыў», засялянчыцкай мітусней, разбуханнем апаратаў і бескантрольнасцю—за аперацыйнае кіраўніцтва, веданне справы, правільны падбор і расстаноўку кадраў і сістэматычную з дня ў дзень праверку выканання.

Канферэнцыя падкрэслівае, што большэвік, які не ўсвойвае гэтых абавязковых патрабаванняў ленінска-сталінскага металу і стылю ў рабоце, не з'яўляецца яшчэ ў поўным сэнсе слова комуністам. Цалкам і поўнасцю далучаючыся да ўсіх прынцыповых і практычных прапаноў, унесімых тэзісамі па дакладу т. Кагановіча, канферэнцыя падкрэслівае, што перабудова ўсіх совецкіх, гаспадарчых, профсаюзных і партыйных арганізацый прадбачыць яшчэ большае разгортванне сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва рабочых і калгаснікаў, яшчэ большае разгортванне большэвіцкай самакрытыкі і масавага кантролю знізу.

Згуртоўваючы ўдарнікаў другой пяцігодкі, учытваючы ўсё новыя і новыя масы ў справу будаўніцтва сацыялізма, наша партыя павінна весці неаслабную сакрушальную барацьбу з класавым ворагам і яго агентурай.

Ажыццяўленне найвялікшых задач другой пяцігодкі немінуча выкліча абвастрэнне класавай барацьбы, новыя спробы ў падрыве калгасаў з боку кулацтва, спробы шкодніцтва і сабатажу на нашых прамысловых прадпрыемствах з боку антысовецкіх сіл.

Адзначаючы, што пераможаны і разгромлены класавы вораг вымушэн у сваёй барацьбе з пролетарскай дыктатурай звярачацца да розных роду маскаванняў і перакрашвання, канферэнцыя заклікае ўсіх большэвікоў, рабочых і калгаснікаў, навуковых і інжынерна-тэхнічных работнікаў Маскоўскай вобласці неаслабна павышаць рэвалюцыйную пільнасць, з дня ў дзень мацаваць пролетарскую дыктатуру, ахоўваць сацыялістычную ўласнасць, цвёрда і няўхільна ўмацоўваць дысцыпліну і павышаць прадукцыйнасць сацыялістычнай працы.

IV.

Рашаючай умовай нашых перамог з'яўляюцца адзінства і згуртаванасць, высокая боязідольнасць партыі—авангарда сацыялістычнага будаўніцтва.

К свайму XVII з'езду партыя прыходзіць як ніколі, як ні ў якія гады, адзінай, маналітнай, моцна спаянай вакол свайго ленінскага ЦК, вакол свайго настаўніка і правадыра т. **Сталіна.**

Гэта несакрушальнае адзінства радоў нашай партыі, забяспечыўшае перамогі сацыялізма, заваёвана ў рэзультаце ўпартай барацьбы з ворагамі партыі і рабочага класа, з усімі відамі апартунізма і прымірэнства.

Толькі дзякуючы геніяльнай праз орлівасці і ленінскай непрымірымасці правадыра партыі т. Сталіна, партыя змагла своечасова ўскрыць і ўпічэнт разграміць контррэвалюцыйны трацкізм і кулацкую агентуру—правы ўхіл.

Асаблівасць данага моманту заключаецца ў тым, што ахвосце меншавіцкай, кулацкай ідэалогіі рэстаўрацыі капіталізма, правыя і «левыя» апартуністы змыкаюцца паміж сабой. Разумеючы поўную безвыходнасць спроб пахіснуць адзінства партыі, яны змыкаюцца з белагвардзейскімі элементамі і з'яўляюцца посьбітамі махрова-контррэвалюцыйных замыслаў.

Канферэнцыя са здавальненнем адзначае высокі якасны рост партыі, узлым ідэйнага ўзроўню партыйных кадраў шырокіх партыйных мас, далейшае ўмацаванне ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, пасяховае разгортванне пролетарскай самакрытыкі ва ўсіх звеннях партыі, пасяховае разгортванне чысткі партыі. Абагульняючы вопыт правядзення чысткі маскоўскай арганізацыі, канферэнцыя асабліва адзначае велізарную яе ролю ў справе павышэння палітычнага ўзроўню партыйнай і дзяржаўнай дысцыпліны і вытворчай актыўнасці членаў партыі.

Ажыццяўленне задач другой пяцігодкі патрабуе яшчэ большага ўмацавання кіруючай ролі нашай партыі, яшчэ большай адказнасці кожнага большэвіка за даручаную яму справу за асваенне тэхнікі, яшчэ большай рэвалюцыйнай пільнасці і большэвіцкай непрымірымасці ў барацьбе з класавым ворагам і яго агентурай. Канферэнцыя падкрэслівае, што для сучаснага этапу захоўвае ўсю сілу і астрату ўказанне XVI з'езда партыі на тое, што агенты класавага ворага ў радах нашай партыі будуць звярачацца да двурушніцтва і маскавання, да заўгу на слова аб прызнанні імі партыі, фактычна-ж сабатуючы і падрываючы гэту лінію на справе.

Канферэнцыя падкрэслівае неабходнасць весці непрымірымую барацьбу з правым і «левым» ухіламі і ўсімі іншымі апартуністамі, двурушнікамі, перараджэнцамі, якія праводзяць справу пролетарскай дыктатуры, і патрабаваць ад кожнага члена партыі не фармальных заяў аб адданасці лініі партыі, а сапраўды большэвіцкай работы, ведання справы на сутнасці, аўладання тэхнікай на любым участку, на якім ён настаўлен партыяй, аўладанне ленінска-сталінскім стылем работы.

* * *

XVII з'езд партыі супадае з дзесятай гадавінай смерці вялікага Леніна, правадыра і заснавальніка нашай партыі і Комуністычнага Інтэрнацыянала, арганізатара перамогі пролетарскай рэвалюцыі. Схіляючы свае сцягі над магілай вялікага правадыра і настаўніка, канферэнцыя са здавальненнем адзначае поўны трыумф яго заветаў, поўную перамогу ленінскага вучэння і яго плана —пабудовы сацыялізма ў нашай краіне.

* * *

Натхняльнікам, арганізатарам і кіраўніком усёй гераічнай барацьбы і перамог партыі за гэта дзесяцігоддзе быў і ёсць геніяльны пераемнік і прадаўжальнік справы Леніна, правадыр і настаўнік партыі, Комінтэрна і міжнароднага рабочага класа—наш родны і любімы т. **Сталін.** Разам з Леніным расціў і пеставаў тав. Сталін большэвіцкую партыю. У горне трох рэвалюцый, у агні грамадзянскай вайны, у непрымірымай барацьбе з апартунізмам выхоўваў т. Сталін кадры нашай партыі, у духу вернасці вучэнню Леніна, у духу беззаветнай барацьбы за перамогу дыктатуры пролетарыята, за пабудову сацыялістычнага грамадства.

На чале ленінскага Цэнтральнага Камітэта, праз орліва адкрываючы перад усёй партыяй і рабочым класам найвялікшыя гістарычныя перспектывы, мабілізуючы масы на барацьбу з ворагамі, падымаючы кожнае практычнае пытанне на ўзровень высокай ленінскай прынцыповасці, глыбока ўваходзячы ў практычныя дэталі штодзённай барацьбы і будаўніцтва, згуртоўваючы рады ВКП(б) у барацьбе за ленінізм, супроць ухілаў і прымірэнчых адносін да іх—тав. Сталін пераможна вядзе нашу партыю, нашу краіну ад перамогі да перамогі. Імя Сталіна, блізкага і роднага мільёнам працоўных нашай краіны і ўсяго свету, стала для нас сімвалам барацьбы за комунізм.

* * *

Канферэнцыя падкрэслівае, што, дзякуючы кіраўніцтву Цэнтральнага Камітэта і т. Сталіна, Маскоўская арганізацыя дабілася велізарных поспехаў у справе ператварэння вобласці са спалучаючай у вытвараючую, у справе большага развіцця лёгкай прамысловасці, у справе ператварэння Масквы ва ўзорную пролетарскую сталіцу.

Маскоўская канферэнцыя запэўняе свой ЦК і т. Сталіна ў тым, што Маскоўская арганізацыя большэвікоў была, ёсць і будзе моцнай апорай ЦК і т. Сталіна ў барацьбе з усімі ворагамі ленінізма, за пераможнае выкананне вялікага сацыялістычнага плана другой пяцігодкі, за поўную пабудову сацыялістычнага грамадства, за сусветную пролетарскую рэвалюцыю.

Няхай жыве наша слаўная ленінская партыя і яе Цэнтральны Камітэт!

Няхай жыве наш вялікі, родны Сталін!

Наперад, таварышы, да новых перамог!

НІЗАЎЦОЎ

УЗЯЦЬ У 1934 ГОДЗЕ ЯШЧЭ БОЛЬШЫ ЎРАДЖАЙ

1933 год з'явіўся годам рэкорднага ўраджаю зернавых культур па ўсяму СССР. Валавы збор зернавых культур у 1933 г. у памерах 898 млн. цэнтн. дасягнута найвышэйшым як за гісторыяй совецкай улады, так і ў параўнанні дазарэвалюцыйных гадоў, рэкорднымі з якіх быў 1913 год, калі валавы збор дасягаў 801 млн. цэнтнераў.

СССР у 1933 годзе, як і большасць рэспублік і абласцей, дабіўся непрадугадванага ўраджаю зерновых у параўнанні з усімі папярэднімі гадамі.

Апублікаваных матэрыялах статыстычнай камісіі па ўраджайнасці мы маем наступныя паказальнікі размераў ураджайнасці і валавых зборы зернавых культур па СССР у 1933 г.:

Назва культур	Ураджай з 1 га у цэнтн.	Валавы збор у тыс. цэнтн.
Усе зернавыя	9,1	22.711
Жыта азімае	9,4	10.809
Жыта яравое	7,8	185
Пшаніца азімая	11,1	640
Пшаніца яравая	9,8	899
Ячмень яравы	10,5	330,7
Авёс	8,7	4.689
Грэчка	5,5	897
Проса	6,9	356
Усе бабовыя	10,0	583
Віка на зярно	9,6	646

Такое механічнае тлумачэнне з'яўляецца палітычна шкадлівым, яно з'яўляецца нічым іншым, як апартуністычным прыкрыццём бязідэйнасці, адсутнасцю большэвіцкай барацьбы і апераціўнага кіраўніцтва за высокі ўраджай з боку кіруючых работнікаў сельскай гаспадаркі як цэнтральных арганізацый, так і значнай часткі раённых кіруючых работнікаў.

Праўда, кліматычныя ўмовы 1933 года былі спрыяльнымі для сельскай гаспадаркі, але гэта не з'яўлялася рашаючым у атрыманні высокага ўраджаю ў 1933 годзе.

1933 год, трэба прама сказаць, з'явіўся пераломным годам у справе ўкарэнення сапраўды большэвіцкага апераціўнага кіраўніцтва ў сельскай гаспадарцы: рост і ўмацаванне сацыялістычнага сектара сельскай гаспадаркі, выкарчоўванне карэнняў шкодніцтва і мабілізацыя партарганізацый за большэвіцкія тэмпы перабудовы сельскай гаспадаркі — гэта і з'явілася рашаючым у значных зрухах сельскай гаспадаркі ў БССР ў 1933 годзе.

БССР знаходзіцца ў такой спрыяльнай кліматычнай і метэаралагічнай зоне, што выключана магчымасць рэзкіх хістанняў ураджайнасці з-за недахопу асаблівых і лішак цяплыні, як гэта мае месца ў другіх частках Совецкага Саюза, (Украіна, Нізкая Волга), дзе пры існаваўшай раней нізкай тэхніцы сельскай гаспадаркі колькасць асаблівых лімітавала вышыню ўраджаю. Наадварот, БССР мае ў некаторыя гады лішкі асаблівых, патрэбнасцяй ўраджай на нізінных мясцах, што мела месца ў радзе раёнаў у 1933 годзе.

РЭЗКАЕ ХІСТАННЕ ЎРАДЖАЮ ПА БССР ТЛУМАЧЫЦЦА НЕ НЕЙКІМІ ХІСТАННЯМІ КЛІМАТЫЧНЫХ І МЕТЭАРАЛАГІЧНЫХ УМОЎ, А, У ПЕРШУЮ ЧАРГУ, АД СУТНАСЦЮ ДА 1933 Г. НАЛЕЖНАГА АПЕРАТЫЎНАГА БОЛЬШЭВІЦКАГА КІРАЎНІЦТВА З БОКУ РАЕНАЎ І, ГАЛОЎНЫМ ЧЫНАМ, НАРКАМЗЕМА БССР СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПЕРАБУДОВАЙ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ.

Пры параўнанні ўраджаю ў 1933 годзе ў параўнанні з мінулымі гадамі мы ўсё-ж маем рэзкія хістанні яго па асобных раёнах. Напрыклад, пры сярэднім ураджаі жыта ў 9,4 цэнтн. з га па рэспубліцы, мы маем 12,5 цэнтн. з га ў **Слуцкім** раёне, 11,6 у **Буда-Кашалёўскім**, 12,47 у **Брагінскім**, 12 у **Хойніцкім**, 6,5 у **Асвейскім**, 6,5 у **Дрысенскім**, 7 у **Бешанковіцкім** і **Плешчаніцкім**.

Асаблівыя вялікія хістанні мы маем па авёсу: пры сярэднім рэспубліканскім ураджаі ў 8,7 цэнтн. з га, такія раёны, як Хойнік маюць 12 цэнтн. з га, Брагін — 12,7, Клічаўскі раён—11,3 цэнтн., Слуцкі—10,3 Жлобінскі — 10,1, Буда-Кашалёўскі — 10,6, Бягомльскі —6,5, Плешчаніцкі — 6,1, Дрысенскі — 6,0, Бешанковіцкі — 6,5, Асвейскі — 6,0, Сіроцінскі — 6,5.

ТАКІЯ РЭЗКІЯ ХІСТАННІ ЎРАДЖАЮ ПРЫВЕДЗЕНЫХ КУЛЬТУР ПАКАЗВАЮЦЬ, ШТО ПРЫ УСЯХ РОЎНЫХ КЛІМАТЫЧНЫХ УМОВАХ ЗНАЧНАЯ ЧАСТКА РАЕНАЎ НЕ ЎЗНАЧАЛІЛА БОЛЬШЭВІЦКАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА ЯКАСНЫЯ ПАКАЗАЛЬНІКІ ЎРАДЖАЮ.

Калі мы возьмем ураджай па трох асноўных культурах — жыта, авёс і ячмень, то будзем мець наступны малюнак: самыя нізкія паказальнікі ўраджаю па гэтых культурах маем па паўночнай груше раёнаў БССР, уключаючы **Крупскі, Бягомльскі і Плешчаніцкі** раёны цэнтральнай зоны. Гэта група раёнаў паўночнай часткі БССР, выключаючы Віцебскі, Аршанскі і Дуброўенскі раёны, дзе зніжэнне ўраджайнасці, якое даходзіць, як ужо падана вышэй, да 6 цэнтнераў з га.

АСНОЎНАЙ ПРЫЧЫНАЙ НІЗКАГА ЎРАДЖАЮ (пры паяўнасці пераважвання больш цяжкіх глеевых глеб) **У ПАЎНОЧНЫХ РАЁНАХ БССР З'ЯЎЛЯЕЦЦА ВЫКЛЮЧНАЯ ЗАСМЕЧАНАСЦЬ ПАЛЁЎ, ЯК РЭЗУЛЬТАТ НІКУДЫ НЯВАРТАЙ АПРАЦОЎКІ ГЛЕБЫ, СПОЗНЕНЫЯ ТЭРМІНЫ СЯЎБЫ, АСАБЛІВА АЎСА, ІГНАРАВАННЕ МІНІМАЛЬНЫХ ПАТРАБАВАННЯЎ АГРАТЭХНІКІ.**

Замечанасць палёў па паўночнай зоне даходзіць да выключных размераў. Так, пры праверцы ў **АСВЕЙСКІМ** раёне з намалочаных 10.536 цэнтнераў жыта 4.391 цэнтнер, або 42 проц., аказалася з пуставеллем.

У калгасе імя **СТАЛІНА, Бешанковіцкага** раёна, з 1392 кгр. адсартаванага зерня жыта аказалася пустых 1.032 кгр., або 73 проц. Аналагічнае становішча мы маем па раду другіх калгасаў паўночных раёнаў, дзе процант пустазелля даходзіць да 75. Такая засмечанасць палёў плюс к гэтаму моцную заражанасць аўсёў іржаўчынай, патрабуе у надыходзячы 1934 год выключнай увагі да гэтых раёнаў.

Да раёнаў, дадзіных высокія паказальнікі ўраджаю, трэба аднесці раёны паўдзённай і сярэдняй зоны БССР (**Пухавічы, Менск, Барысаў, Копыль, Слуцак, Клічаў, Чырвоная Слабада, Старыя Дарогі, Рагачоў, Жлобін, Любань, Старобін, Буда-Кашалёва, Хойнікі, Брагін, Рэчыца**).

Гэтыя раёны пры роўных кліматычных умовах, але пры паяўнасці своечасовага правядзення ўсіх сельска-гаспадарчых кампаній далі высокія паказальнікі ўраджаю, г. зн. звыш 10 цэнтн. па жыту і другіх культурах.

Асобнай групай стаяць раёны сярэдняй часткі БССР. **Горацкі, Мсціслаўскі, Крычаўскі, Клімавіцкі, Казяцкавіцкі, Чэрыкаўскі, Чырвонапольскі і Жэрмяльскі**, дзе мы маем такога, як і ў паўночных раёнах, паніжаную ўраджайнасць, г. зн. не вышэй 8 цэнтнераў. Указаныя раёны маюць амаль роўныя ўмовы як глебавыя, так і кліматычныя, з большасцю раёнаў высокага ўраджаю, але адсутнасць барацьбы за высокія якасныя паказальнікі вядзення сельскай гаспадаркі дала значна паніжаны ўраджай.

НА ПРЫКЛАДЗЕ ГЭТЫХ РАЁНАЎ АСАБЛІВА ЯРКА ДАКАЗВАЕЦЦА, ШТО КЛІМАТЫЧНЫЯ УМОВЫ 1933 ГОДА НЕ МЕЛІ РАШАЮЧАГА ЗНАЧЭННЯ, А, ГАЛОЎНЫМ ЧЫНАМ, ВЫРАШАЛА СПРАВУ ЯКАСЦЬ ПАРТЫЙНАГА І СОВЕЦКАГА КІРАЎНІЦТВА.

Трэцяя група па ўраджаю гэта паўдзённая частка БССР (Палессе). На гэтай груше раёнаў у 1933 г. мы мелі высокі ўраджай — 8,97 цэнтн. з га па ўсіх зернавых, не гледзячы на лёгкія, пясчаныя, моцна ападзоленыя глебы. Атрыманне такога ўраджаю тлумачыцца паяўнасцю больш ранняй сяўбы, лепшай апрацоўкай глебы і багаццем асаблівых у параўнанні з мінулымі гадамі.

Гэта група раёнаў, знаходзячыся ў зоне з больш рэзкімі хістаннямі ў сэнсе асаблівых і метэаралагічных фактараў наогул, патрабуе асаблівага падыходу ў вядзенні сельскай гаспадаркі. У гэтых раёнах такія культуры, як авёс і ячмень, пазбаўленыя высакавіцца пераважна знаходзяцца ў слабой, — паніжаныя заабалочаныя месцы павінны быць дрэнаваны прасцейшым спосабам, павінна быць таксама настаўлена ва ўсю шырыню пытанне аб узмацненні і адпаведнай апрацоўцы глебы.

Поспехі, дасягнутыя ў сацыялістычным будаўніцтве сельскай гаспадаркі БССР у 1933 годзе, з'яўляюцца рэзультатам правядзення ленінскай лініі партыі, непрымірымай барацьбы з класавым ворагам і сістэматычнага згуртавання калгасных мас на барацьбу за ажыццяўленне лозунга тав. Сталіна «арабіць усе калгасы большэвіцкімі і ўсіх калгаснікаў заможнымі».

1934 год паўнёсна з'явіцца годам настойлівай большэвіцкай барацьбы за высоўванне сельскай гаспадаркі БССР у перадавыя рады абласцей Совецкага Саюза. Барацьба за высокі ўраджай ёсць перш за ўсё барацьба за якасныя паказальнікі пры правядзенні ўсіх сельска-гаспадарчых работ. Асаблівая ўвага павінна быць звернута на наступнае: пры давядзенні планаў веснавой сяўбы да раёнаў Наркамземам БССР павінна быць строга ўлічана колькаснае і якаснае становішча па сеўных плошчаў. Размеркаванне асобных культур і давядзенне плана пасеваў іх да раёнаў павінна праводзіцца, выходзячы з глебавых умоў, з улікам усіх эканамічных асаблівасцяй кожнага раёна. Такім-жа парадкам павінна быць праведзена давядзенне плана ў кожным раёне да сельсоветаў і калгасаў. Трэба рашуча зжыць механічнае размеркаванне пасеўных залаў, што пераважала ў планаванні пасеўных плошчаў у 1933 г. і мае месца дагэтуль і зараз пры планаванні яравых пасеваў 1934 г.

Асаблівае выключнае значэнне ў надыходзячую веснавую сельска-гаспадарчую кампанію будзе адыгрываць пытанне забеспячэння пасеўным матэрыялам. Неспрыяльныя кліматычныя ўмовы ў часе ўборкі яравых у 1933 г., паяўнасць значнай заражанасці іржаўчынай аўса патрабуюць не менш чым падвойнай праверкі ўсяго пасеўнага фонду на ўсхожасць і своечасовага правядзення работы па абмену непрыгоднага насення на высокаякаснае зерно.

Асаблівага вострага стаіць пытанне з насенным матэрыялам па аднаасобнаму сэктару. Мы не можам забываць, што пры паніжэнным выкананні засыпкі насення па калгасаму сэктару мы не дабіліся поўнага выканання засыпкі насеннага фонду па аднаасобнаму сектару. Тут павінны быць улічаны памылкі 1933 года, калі па раду раёнаў, аднаасобнікі замест сапраўднай засыпкі насення выдавалі толькі распіскі, а раённае кіраўніцтва не правяло належнай праверкі паяўнасці насення. У рэзультаце чаго ў 1933 годзе мы мелі вялізарны недасеў па аднаасобнаму сэктару, асабліва такіх культур, як авёс і лён.

Не гледзячы на тое, што ў 1933 годзе сяўба яравых была правядзена ў больш кароткі тэрмін ў параўнанні з мінулымі гадамі, тым не менш і гэты тэрмін не з'яўляецца здавальняючым. У бягучым годзе неабходна рэзка павысіць плошчу звышранняй сяўбы, што ў сваю чаргу дасць магчымасць скарачэнь тэрміны звычайнага пасеву. Для правядзення звышранняй сяўбы неабходна яшчэ ў зімовы час вылучыць адпаведныя ўчасткі як у калгасах, так і ў аднаасобным сэктары. Такія культуры, як авёс, ячмень і віка на зярно, павінны ў асноўным высяваць звышранняй сяўбой. Каб пазбавіцца ад замечанасці палёў патрэбна, апрача пільнайачысткі пасеўнага матэрыяла, праводзіць ручное поліванне суцэльнымі масівамі, асабліва ў паўночных раёнах.

Указаныя вышэй мерапрыемствы, узятыя ў пасобку, далёка не гарантуюць атрымання высокага ўраджаю, толькі комплекснае іх прыстасаванне з'яўляецца заручкай атрымання больш высокага ўраджаю ў 1934 г.

1934 год павінен быць годам яшчэ больш высокіх дасягненняў у сацыялістычным будаўніцтве сельскай гаспадаркі БССР.

Пазбавіць сваю работу, XV з'езд КП(б)Б сваім рашэннем намеціць бачную апераціўную праграму далейшага сацыялістычнага будаўніцтва сельскай гаспадаркі ў БССР як на 1934 год, так і на наступныя гады другой пяцігодкі.

Назва культур — Ураджай з 1 га у цэнтн. — Валавы збор у тыс. цэнтн.

	1924 год	1925 г.	1926 г.	1927 г.	1928 г.	1929 г.	1930 г.	1931 г.	1932 г.
Ураджай у цэнтнерах з 1 га									
Жыта азімае	7,0	7,1	5,9	6,4	6,47	7,4	8,04	6,2	6,02
Авёс	8,3	7,8	5,9	5,6	7,57	7,83	8,63	7,3	6,02
Ячмень	7,4	7,7	6,7	6,5	7,34	7,7	6,97	7,56	7,24
Віка на зярно	—	—	—	—	5,47	5,77	6,78	6,02	7,01

Калі мы прааналізуем даныя ўраджаю 1932 года па асноўных культурах, то убачым, што ў 1933 годзе СССР дабілася значных поспехаў у справе барацьбы за высокія якасныя паказальнікі ў сельскай гаспадарцы, што пацвярджаецца наступнымі данымі.

За 1932 год

| Назва культур | Ураджай з 1 га у цэнтн. | Вал. збор у

Тэзісы к 10-цігоддзю смерці В. І. ЛЕНІНА

(Канец. Пачатак на 2 стар.).

біліся ў вёсцы агульным правілам»[56]). Наступленне социялізма ў вёсцы Ленін звязваў з бязлітасным барацьбой супроць кулацтва. Ленін кампчаў этапы гэтай барацьбы: спачатку — абмежаванне эксплятарскіх тэндэнцый кулацтва, а затым па меры ўмацавання буйной прамысловасці і пазіцый социялізма ў вёсцы — экспрапрыяцыю кулацтва. «Калі ты дасі машыну ці электрыфікацыю, тады дзесяткі ці сотні тысяч дробных кулакоў будуць забіты»[57]). Знішчэнне кулацтва будзе «апошнім і рашучым боем»[58]) супроць рускага капіталізма. Яно завершыць барацьбу супроць буржуазіі ў нашай краіне.

Социялістычную перапрэбку вёскі Ленін лічыў самай трудной, але разам з тым і рашаючай задачай пляцярыята, будуючага социялізм. «Дзесяць-дваццаць год правёўных суадносін з селяніством і забяспечана перамога ў сусветным маштабе (нават пры зацяжным пролетарскіх рэвалюцый, якія растуць»[59]).

16. Ленін лічыў, што ні развіццё прамысловасці, ні развіццё сельскай гаспадаркі, ні павышэнне дабрабыту рабочых і селян немагчымы без развіцця тавараабарота паміж горадам і вёскай, паміж прамысловасцю і земляробствам.

Ленін патрабаваў, каб дзяржаўны гандаль і кааперацыя здолелі падпарадкаваць сабе рынак, здолелі лепш заспокоіць рабочых і селян, чым гэта рабілі капіталісты. Ленін патрабаваў, каб комуністы «вучыліся гандляваць» і прытым «гандляваць культурна». Ленін надаваў асаблівае значэнне забеспячэнню насельніцтва праз кааператыўную сістэму, дабіваючыся таго, «каб усё насельніцтва ахапілася кааператывамі і каб гэтыя кааператывы зліваліся ў агулны, звяху да нізу ахапляючы ўсю совецкую распубліку кааператыў»[60]).

17. Магчымасць пабудовы поўнага социялістычнага грамадства ў нашай краіне Ленін разумеў, як магчымасць пабудовы социялізма сваімі сіламі за кошт УНУТРАНЫХ НАКАПЛЕННЯЎ совецкай краіны. Не адмаўляючыся ад спроб прыцягнуць на пэўных умовах замежны капітал (канцэсіі, пазыкі), Ленін лічыў, што і без гэтай «дапамогі» звонку наша краіна здолее пабудаваць социялізм, калі здолее «ўсякае магчымае зберажэнне захаваць для развіцця нашай буйной машыннай індустрыі, для развіцця электрыфікацыі, гідраторфу, для дабудавання Волхаўбуда і інш.»[61]).

Пролетарыят здолее адшукаць унутры краіны сродкі, неабходныя для развіцця гігантскага плана социялістычнай будоўлі, калі здолее весці акуратна і добрасумленна рахунак грошай, «берагчы капейку», гаспадарыць эканомна, выганяць «са сваіх прамадскіх адносін усякія сляды, якіх-бы там ні было злішастваў»[62]), настойліва скарачаць дзяржаўны апарат, умацоўваць совецкі жоўнер, скарыстоўваць паравагі замежнага гандлю, весці правільную падатковую палітыку, пасля доўга пра[illegible]одзіць гаспадарчы разрахунак.

18. «Пролетарыят пасадаўляе і ажыццяўляе [illegible] больш высокі тып ГРАМАДСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ ў параўнанні з капіталізмам»[63]).

Ленін называў [illegible] працоўную дысцыпліну «квазідом усяго [illegible]». Толькі работнічыя і селянскія [illegible] сваёй свядомасцю і дысцыпліна[illegible] эканамічныя перабудаваць старыя [illegible] ўмовы існавання і пра[illegible] ў жыццё вялікі гаспадарчы план»[64]).

Барацьба за социялізм — суровая і трудная школа, у якой [illegible] будуючы социялізм, перавыхо[illegible] сябе. Ленін высунуў розныя [illegible] выхавання працоўных у духу новай дысцыпліны: социялістычнае [illegible] ніцтва «для няўхільнага павы[illegible] арганізаванасці, дысцыпліны, [illegible] цыйнасці працы, для пераходу да [illegible] шэйшай тэхнікі, для эканоміі [illegible] цы і прадуктаў.

(Працяг у наступным нумары).

[56]) Ленін. Творы, том 24, стар. 40.
[57]) Ленін. Творы, том 26, стар. 246.
[58]) Ленін. Творы, том 27, стар. 235.
[59]) Ленін. Творы, том 26, стар. 313.
[60]) Ленін. Творы, том 24, стар. 103.
[61]) Ленін. Творы, том 27, стар. 417.
[62]) Ленін. Творы, том 27, стар. 417.
[63]) Ленін. Творы, том 24, стар. 336.
[64]) Ленін. Творы, том 25, стар. 139; том 26, стар. 34.

Лесазагатоўкам і вывазкам—максімум увагі

Не забываць, што студзень і люты рашаюць выкананне гадавой праграмы вывазкі

Лесазагатоўкі—„справа другарадная"

Не гледзячы на рад дырэктыў ЦК партыі і Соўнаркома аб фарсаванні лесазагатовак і вывазкі, па МАЗЫРСКАМУ РАЁНУ не відаць ніякага зруху. 1933 год скончан з вялікім прарывам: план загатоўкі дзелавой драўніны выкананы на 65,8 проц., дроў—на 51,7 проц. План вывазкі дзелавой драўніны выкананы на 13,9 проц., дроў—на 43,9 проц. Асабліва адстаюць лесаўчасткі ЮРАВІЦКІ, СЛАБОДСКІ і ГАРОЧЫЦКІ. Першая дэкада новага года таксама закончана з вялікім прарывам. План загатоўкі дзелавой драўніны выкананы на 10 проц., дроў—на 5,1 проц. План вывазкі драўніны выкананы на 5,6 проц., дроў—на 11,8 проц.

Такі вялікі прарыў тлумачыцца выключна адсутнасцю ўвагі да лесазагатовак і вывазкі з боку мазырскіх раённых арганізацый. За апошні час у сельсоветы паслана шмат людзей. Кожны з іх атрымліваў ад райкома партыі рад заданняў: па загатоўцы тэхкультур, ільнавалакна, пянькі, па мабілізацыі сродкаў і, зразумела, па лесазагатоўцы і вывазцы. Такая сістэма заданняў сама па сабе адсоўвала лесазагатоўкі на задні план. Упаўнаважаныя райкома не ведалі, за якую справу ім раней узяцца. Шматлікія факты зрыву лесазагатовак і вывазкі не спаткалі патрэбнага адпора. Рад сельсоветаў—ГУЛЕВІЦКІ, КАЗІМІРАЎСКІ, ЯКІМАВІЦКІ, АНТОНАЎСКІ, КАПЛІЦКІ, ДАМАНАВІЦКІ і інш. не далі ні адной фурманкі або выканалі планы лесавывазкі на 2-3 проц.

Старшыня калгаса «Чырвоныя Юшкі», Дудзінкага сельсовета, БАБРОЎ адмовіўся заключыць дагавор з Гарочыцкім лесаўчасткам, патрабуючы выдачы яму радыёпрыёмніка ў якасці папярэдняй узнагароды.

Не гледзячы на гэтыя шматлікія факты сабатажу дырэктыў партыі, ні сельсоветы, ні мазырскі РВК не аштрафавалі і не аддалі пад суд ні аднаго чалавека, ні аднаго кулака, які ўхіліўся ад лесазагатовак і вывазкі.

Старшыня РВК тав. ЖОГАЎ нават зусім забыў аб лесазагатоўках. Калі ён у якасці ўпаўнаважанага райкома партыі быў у Сухавіцкім сельсавеце, ён аб усім гаварыў, толькі не аб лесазагатоўках. Старшыня гэтага сельсавета тав. ЛОРМАН толькі пад націскам сакратара парт'ячэйкі леспрамгаса тав. ФЕЙГЕЛЬМАНА склікаў сход, прысвечаны заключэнню дагавора.

Апарат мазырскага леспрамгаса працуе слаба. Раённая газета «Калгаснік Мазырчыны» лесазагатоўкамі зусім не займаецца. Яна змясціла два артыкулы і на гэтым паставіла крэпку.

Р. Б. БУРДЗІН.

Новы год не ўнёс ніякіх змен

У мінулым годзе ЧЭРЫКАЎСКІ ЛЕСПРАМГАС працаваў вельмі дрэнна. Апарат леспрамгаса быў здарваны ад сельсоветаў. Перакідванне тэхнічных работнікаў з аднаго ўчастка на другі стварала абязлічку. Лясная варта была падабрана так кепска, што загатоўлены лес раскрадваўся, а штрафы за лесапарушэнні не спаганяліся. Не было масавай работы з возчыкамі і лесарубамі. Бытавым умовам рабочых не аддавалася ніякай увагі. З вялікім спазненнем выдавалі заработную плату.

НОВЫ ГОД НЕ ЎНЁС НІЯКІХ ЗМЕН. Недахопы мінулага года не ліквідаваны. Як і ў мінулым годзе, вельмі слаба праводзіцца масавая работа з лесарубамі і возчыкамі. Чырвоныя куткі ў большасці не працуюць. Бытавыя ўмовы лесарубаў і возчыкаў не на вышыні. Не арганізавана падвозка абедаў на ўчастках. Часты выпадкі, калі рабочых кормяць гнілой бульбай. У сістэме харчавання пануе ўраўнілаўка—лепшыя ўдарнікі не вылучаны ў асобную групу і атрымліваюць такія-ж абеды, як і тыя рабочыя, якія не выконваюць нормы.

На многіх участках (ЧЫРВОНА-ПОЛЬСКІ ўчастак, Нівенская дача) рабочыя не ведаюць сваіх норм выпрацоўкі. Дагаворы з калгасамі заключаны фармальна, у габінетным парадку. Скрасныя брыгады не створаны. Напрыклад, калгас «Ударнік», Горкаўскага сельсавета, стварыў брыгаду ў пяць лесарубаў, за якімі замацаваў двух коняй. Коні выкарыстоўваюцца не для вывазкі леса, а для падвозкі лесарубаў да месца працы. Цэлы-ж дзень коні стаяць.

Соцыялістычныя метады работы праводзяцца толькі на паперы. За ключэн соцдагавор, але ён не выконваецца. Ні на адным лесаўчастку няма пасцепнай газеты.

У выніку такой работы план загатоўкі драўніны першай дэкады выкананы на 9,7 проц., дроў на 11,3 проц. План вывазкі драўніны выкананы на 4,7 проц. і дроў на 7,2 проц.

Так працаваць далей нельга. Ц.

ПА БССР

УДЗЕЛ БССР НА ВЫСТАЎЦЫ, ПРЫСВЕЧАНАЙ XVII З'ЕЗДУ ВКП(б)

У выстаўцы, якая арганізуецца ўсесаюзным таварыствам культурнай сувязі з заграніцай да дня адкрыцця XVII з'езда ВКП(б), а пасля накіруецца ў Еўропу і Амерыку, вялікі ўдзел прымаюць культурныя арганізацыі БССР.

Беларуская мастацкая літаратура на выстаўцы будзе прадстаўлена вершамі, апавяданнямі, аповесцямі і раманамі Якуба Коласа, Александро кіча, Чорнага, Лынькова, Галавача, Крапівы і інш.

Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі накіравала на выстаўку каля 100 кніг, выданых за апошнія два гады. Сярод іх сельскагаспадарчая, дзіцячая, ваенная літаратура, а таксама літаратура нацменшасцей.

Белдзяржкіно накіроўвае на выстаўку камплект фото вядучых карцін («Першы ўзвод», «Паручык Кіжэ») і фото-плакат, які ілюструе дасягненні Беллзяржкіно, рост кінопрадукцыі БССР.

У фотаэдымках і дыяграмах будзе паказана работа 4-й, 6-й, 7-й, 25-й і 27-й менскіх школ, дзіцячы сад завода «Комунар», яўрэйскі дзіцячы сад № 1 і польскі сад № 13, а таксама дзіцячая тэхнічная станцыя і менскае дзіцячае кіно.

У выстаўцы прымаюць удзел Беларуская Акадэмія Навук, Дзяржаўная бібліятэка, беларускі і яўрэйскі дзяржаўныя тэатры і тэатр оперы і балета.

У дыяграмах будзе таксама паказан рост выдання газет і журналаў.

ЭНЕРГАХІМІЧНЫ КАМБІНАТ УСЕСАЮЗНАГА ЗНАЧЭННЯ

ПЕРСПЕКТЫВЫ ПРАПОЙСКА

Пачата падрыхтоўчая работа па будаўніцтву Прапойскага энергахімічнага камбіната ўсесаюзнага значэння.

Увесь мінулы год быў выкарыстан для [illegible] доследвання тарфяных балот вакол Прапойска. Работы праведзены інстытутам прамысловасці і Белторфам. Цяпер [illegible] вядуцца камеральная апрацоўка матэрыялаў і лабараторныя іспытанні торфу. ВЫЯЎЛЕНЫ ВЕЛІЗАРНЫЯ ЗАПАСЫ ТОРФУ — 30-40 МЛН. ТОН.

Заключан дагавор з «Мосгеаразведкой» аб вытэлі[illegible] запасаў і ўмовах эксплаатацыі [illegible] прапойскіх даламітаў. Запас іх вызначаецца ў 24 млн. тон, з іх трэба выявіць 3-5 млн. т. найбольш падыходзячых да эксплаатацыі. Даламіты дадуць сырэц для тарэмазвальнай — «сакаліт» і іншыя магнезіяльныя солі.

Запас прапойскіх фасфарытаў у асноўным выяўлен у размерах 21 млн. тон. Далейшыя вышукі запасаў праводзяцца «Мосгеаразведкой» у верхавіне Сожа.

Нядаўна ў Маскве арганізавана брыгада з 50 выдатных спецыялістаў, якой даручана распрацаваць практычныя заданні камбіната па ўсіх паказальніках (канчатковая схема камбіната, капіталаўкладанні, тэхналагічныя працэсы, энергетычная гаспадарка і т. д.).

Папярэдняя маляэ камбіната складзена кіраўніцтвам упаўнаважанага Наркомцяжпрома СССР і была разглядзена камітэтам хімізацыі СССР, які адзначыў, што Прапойскі камбінат павінен с'явіцца ўдалым варыянтам вырашэння праблемы гафасфаты торфу.

Камітэт адзначыў, што выбраны для пабудовы камбіната Прапойск с'яўляецца адным з лепшых пунктаў Саюза, дзе ў адным месцы спалучаецца фасфарытны і азотны сырэц.

ПРЭМІРАВАННЕ ЛЕПШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ БССР

За выкананне ўзятых абавязацельстваў па першаму ўсесаюзнаму спаборніцтву ВНУ і тэхнікумаў усе беларускі камітэт спаборніцтва прэміраваў лепшыя навучальныя ўстановы БССР.

Менскі архітэктурна-будаўнічы тэхнікум — 15 тысячамі руб. Тарфяному і хіміка-тэхналагічнаму факультэтам політэхнічнага інстытута, планава-эканамічнаму факультэту інстытута народнай гаспадаркі і віцебскаму тэкстыльнаму тэхнікуму вызначаны прэміі па 10 тыс. руб., віцебскаму фінансаваму і маслёўскаму політасветнаму тэхнікуму — па 5 тыс. руб. (БЕЛТА).

2.000 РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКІХ ПРАПАНОЎ

ГОМЕЛЬ, 20 студзеня.

На прадпрыемствах Гомеля развярнуўся масавы збор рацыяналізатарскіх прапаноў у фонд імя XVII з'езда ВКП(б).

Рады вынаходцаў і рацыяналізатараў выраслі больш чым да 2.500 чалавек. За 1933 год паступіла 4.852 рацыяналізатарскія прапановы з умоўнай гадавой эканоміяй у 1.326 тыс. руб. Рэалізацыя гэтых прапаноў ужо ў 1933 годзе дала звыш пяцьсот тысяч рублёў рэальнай эканоміі.

За паўтара месяца ў фонд імя XVII з'езда ВКП(б) паступіла каля 2 тыс. прапаноў. Па аднаму заводу імя Ланцуцкага сабраны ў гэты фонд 444 прапановы, з якіх 250 ужо рэалізаваны.

Ад рэалізацыі прапаноў вынаходцы-рацыяналізатара тав. Купчыкава дрэваапрацоўчы камбінат імя Гікало атрымаў 330 тыс. руб. эканоміі (БЕЛТА).

АДКАЗВАЕМ НА ПАСТАНОВУ ЦК

ШКЛОЎ, 20. (Па тэлефону ад нашага к.).

Пыроцкай хвалай вытворчага нарады была спаткана на Шклоўшчыне пастанова партыі і ўрада аб дазволе працоўным Беларусі прадаваць лішкі свайго хлеба. 15 студзеня паасобныя калгасы, калгаснікі і працоўныя аднаасобнікі пачалі продаж кааперацыйным арганізацыям лішкаў хлеба. Так, прыкладна, калгас «Зара», Старасельскага сельсавета, прадаў сельспажыўтаварыству 64 кгр. зярна, а калгаснікі гэтага сельсавета — 12 кгр. Калгас «Соцыялізм», гэтага-ж сельсавета — 101 кгр. і калгаснікі — 20 кгр. Калгаснік Васільева Мар'я з калгаса «1 мая» прадала 5 кгр. зярна, а аднаасобнік з вёскі Старымля — 56 кгр.

Калгасы «Новая Тураўшчына» і «1 мая», Загаранскага сельсавета, прадалі кааперацыі па 1 цэнтн. зярна і ў калгаснікаў гэтых калгасаў закуплена больш 100 кгр. Сліжэўскім сельспажыўтаварыствам на працягу 2-х дзён закуплена ў калгаснікаў «Чырвоныя Сліжы», «Новыя Сліжы» і ў калгасе «Чырвоная Аўчаса» 2 з паловай цэнтн. зярна, у калгаснікаў ½ цэнтн. і 44 кгр. у аднаасобнікаў. Усяго на 20 студзеня па сістэме райспажыўтаварыства закуплена зярна звыш 200 цэнтнераў.

Закупка шаводзіцца пад лозунгам: ні аднаго кілограма хлеба спекулянту і перакупшчыку.

Каласоўскі.

КАЛГАСНАЕ ВЫНАХОДСТВА

Усебеларускі збор рацыяналізатарскіх прапаноў, абвешчаны ЦК КП(б)Б, выклікаў значны рост вынаходства і рацыяналізацыі ў соўгасах і калгасах БССР.

Калгаснік с.-г. арцелі «Рассвет», Хойніцкага раёна, тав. ЧАРНЯК унёс прапанову аб выкарыстанні сілы ветранага млыноў для механізацыі работ у калгасе. У свайм калгасе т. Чарняк на практыцы ажыццявіў гэту думку: ён лай ветрака прыводзяцца ў рух тачарны варштат, сілаарэзка, кармарэзка і інш. с.-г. машыны, што вызваляе кожны дзень ад работы больш 10 чалавек і трактар, якім раней прыводзіліся ў рух гэтыя машыны. НКЗ БССР пашырае гэты вопыт у іншыя калгасы.

Каваль калгаса імя Фрунзе, Шклоўскага раёна, тав. ЗАДАЎ унёс праект бульбакамбайна, які выворвае бульбу, аддзяляе яе ад бульбяніцча, выбірае з зямлі, сартуе і ссыпае праз спецыяльныя скрынкі ў мяшкі. Гэты камбайн замяняе сабой 50-60 рабочых. Выпускаецца эксперыментальны экземпляр гэтага камбайна.

Калгаснік-вынаходца т. ЭРДМАН, Дрысенскага раёна, вынайшаў цэнтрабарабан для папярэдняга бункавання трактара, які працуе на вільготнай глебе, асабліва ў часе звышпранняй сяўбы. Гэта вынаходка пашырае скарыстанне трактара і механізуе звышпранную сяўбу, эканомячы гаручае да 20 проц. Малышанская станцыя пры НКЗ БССР выпускае пробны экземпляр цэнтрабарабана.

Вядомы вынаходца балотнага плуга тав. ФОМІЧ у палаўрэзах XV з'езду КП(б)Б вынайшаў варштат для апрацоўкі шатунных падшыпнікаў у трактарах. Вынаходка тав. Фоміча замяняе сабой варштаты, якія ўвозяцца з-за граніцы. Замежныя варштаты каштуюць 2 тыс. р., а варштат Фоміча толькі 200-250 р.

Тэхнічна-эксперыментальны совет НКЗ БССР пастанавіў зрабіць 250 варштатаў Фоміча.

Студэнт вышэйшай с.-г. школы імя Леніна тав. САЛАЎЁЎ прапанаваў праект механічнай сушыльні, пабудаванай па прынцыпу вентыляцыі. Гэтай сушыльняй за дзень можна праўшыць 40 тон зярна і яе можна выкарыстоўваць у полі пры рабоце камбайна, пры ссыпцы вернавых у склады, а таксама і на заготаўчых пунктах (БЕЛТА).

ЛЕНІНСКІЯ ДНІ

22-га студзеня ў Менскім Доме вучоных — вечар памяці Леніна. Тав. Сеевіч выступіць з дакладам на тэму «Дзесяць год без Леніна пад сцягам Леніна».

23-га ў Доме вучоных наладжваецца вечар, прысвечаны 25-годдзю выхаду кнігі В. І. Леніна «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм». Акадэмік Бурстын, прафесары Сапір, Усенскі зробяць даклады на тэму «Ленін і крызіс сучаснага прыродазнаўства ў капіталістычных краінах».

У Белдзяржмузеі адкрылася вялікая выстаўка «10 год без Леніна па ленінскаму шляху».

ПАСТАНОВА

ПРЭЗІДЫУМА МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ.

19 студзеня 1934 года. Гор. Менск.

Аб правядзенні дзесятай гадавіны смерці Владзіміра Ільіча ЛЕНІНА і 9 студзеня 1905 года.

Менскі гарадскі совет рабоча-сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Абавязаць усе дзяржаўныя і кааперацыйныя арганізацыі, а таксама і дамаўладнікаў 21 студзеня не позней 16 гадзін (4 гадзіны дня) вывесіць жалобныя сцягі.

2. 21 студзеня 1934 года ў 18 гадзін 50 мінут знізіць узнятыя сцягі на 10 мінут.

3. 21 студзеня ў 18 гадзін 50 мінут усім прадпрыемствам і чыгункам даць працяжныя трывожныя гудкі—5 мінут.

4. Дзяржаўны і кааперацыйны гандаль, а таксама праца ў сталоўках праводзіцца 21 студзеня ў звычайным парадку.

5. Нагляд за выкананнем гэтай пастановы ўскладаецца на РС міліцыю.

Нам. старшыні Менскага гарсовета ТУРЭЦКІ.

Сакратар Менскага гарсовета КАПЯЛЬВІЧ.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ

Першы Дзяржаўны Тэатр БССР (БДТ—1)
СЁННЯ, 21 студзеня АДКРЫТЫ СПЕКТАКЛЬ
Пэўма Чорны
„БАЦЬКАЎШЧЫНА"
Пачатак у 8 гадз. веч.

Кіно „СПАРТАК" З 20 студзеня
выдатны фільм
КАШЫНІСТ УХТОМСКІ
драма ў 8 частках.
У ПРАГРАМЕ
ДОМ МУЗЕЯ ЛЕНІНА.
ШТОДЗЕННА 5 СЕАНСАЎ.—Каса—з 4 гадз.

Гукавы кіно-тэатр ЧЫРВОНАЯ ЗОРА — Дзіцячы гукавы фільм
Дзіцячы гукавы кіно-тэатр — Дакументальны фільм ПА ЛЕНІНЕ — ВЯЛІКІ ШЛЯХ

Кіно Дзяржынкі — Мастацкі совецкі фільм КОРД-ОСТ

Кіно ПРОЛЕТАРЫЯ — Новы мастацкі совецкі фільм ГОРОД пад УДАРАМ

Кіно СПАРТАК — Замежны фільм ЗВЫЧАЙНАЯ ГІСТОРЫЯ

ФЗВ ПАНЧОШНІКАЎ
АБВЯШЧАЕ
зімовы набор
даяўчат на базе 5,6, 7 груп ва ўзросце 16, 17, 18 год.
Для паступлення неабходны наступныя дакументы: аб 4 асце, метрыка, аб сацыяльным паходжанні.
Вучні забяспечваюцца інтэрнатам і стыпендыяй (першыя тры месяцы па 35 руб., другія тры месяцы па 47 руб.). Таксама рабочым пайком (ОРС) і сталовай.
Адрас: Віцебск, Ленінская 3-2, ФЗВ панчошнікаў.

УВАГА!
Да веснавой пасеўнай кампаніі
МАГАЗІН № 21 БЕ ГАНДЛЮ
(Свярдлоўская, 19)
Мае вялікі выбар РЫМАРНЫХ ВЫРАБАЎ
Продаж оптам і ў раздроб.
У першую чаргу аб'лугоўваюцца калгасы, калгаснікі і соўгасы.
У мага іне прым юцца папярэднія заказы.
Па нешчаму залатрабаванню высылаецца прэйс-курант цэн.
Адгрузка выконваецца на працягу 10 дзён.
МЕНГАНДАЛЬ.

Пры Менскім беларускім педагагічным тэхнікуме
з 20-1—34 г. адкрываюцца
8-месячныя КУРСЫ
па падрыхтоўцы настаўнікаў для рускіх школ.
Курсанты забяспечваюцца стыпендыяй, інтэрнатам і сталовай.
Да заявы трэба прыкласці: заведчаную анкету, метрыку, пасведчанне аб асвеце, даведку аб сацпаходжанні і соцстановішчы, даведку ад доктара.
Дакументы даслаць па адрасу: Менск, Совецкая 107, Белпедтэхнікум.
Дырэкцыя.

ПАТРЭБЕН
вопытны
ЧАРЦЁЖНІК.
Зварачацца: ЯБВШ.

Нарсуд жыхарэвы г. Менска абвяшчае грамадзянскае ганьбаванне гр. Нарбута Язэпавіча, праж. па Комсамольскай вул. № 50-4, згодна прыгавора суда ад 3-1—34 г.

ТАБЛІЦА

24-го тыража выйгрышаў пазыкі „3-га рашаючага года пяцігодкі" (аб'яв. про ангна-аяспрой рышна а выпуск)

Тыраж выйграны у праводзіўся ў гор. Калініне 10 і 11 студзена 1934.

№№ серый	№№ аблігацый	Сума выйгрышу	№№ серый	№№ аблігацый	Сума выйгрышу
0032	28*)	500	5828	91*)	500
0208	24*)	500	5829	42*)	200
0253	07*)	200	5863	1—100	50
0574	82*)	200	5920	32*)	500
0754	86*)	200	5992	10*)	500
0905	55*)	200	6041	14*)	200
090	1—100	100	6160	18*)	200
0933	1—100	50	6210	48*)	500
0953	56*)	200	6418	83*)	500
1077	1—100	50	6473	40*)	200
1239	11*)	500	6754	1—100	50
1813	06*)	200	6869	98*)	200
1825	26*)	200	6957	30*)	200
2233	84*)	500	7183	43*)	200
2376	16*)	500	7499	80*)	500
2744	73*)	200	7557	47*)	200
2784	47*)	500	7702	58*)	200
3047	50*)	500	7739	85*)	200
3073	04*)	200	7759	19*)	200
3113	97*)	200	7951	88*)	500
3147	79*)	500	7953	53*)	500
3161	34*)	200	8241	41*)	200
3550	02*)	500	8242	67*)	200
3569	82*)	200	8620	74*)	200
3637	74*)	200	8791	1—100	20
3697	47*)	500	9000	32*)	200
3916	02*)	200	9138	59*)	200
4086	12*)	200	9141	55*)	200
4116	01*)	200	9186	78*)	500
4178	31*)	200	9278	84*)	200
4266	85*)	500	9380	15*)	500
4544	58*)	200	9401	55*)	200
4643	55*)	200	9531	42*)	200
4706	76*)	200	9600	89*)	200
4772	82*)	500	9723	03*)	200
4811	1—100	50	9766	92*)	200
5033	21*)	200	9829	1—100	50
5440	13*)	200	9944	12*)	200
5456	71*)	200	9943	63*)	200

*) Усе іншыя 99 аблігацый гэтай серыі выйгралі па 20 р. кожная

Кіраўніцтва ашчадкасамі і Дзяржрэдпрэта БССР.

Гарадзкі тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі
у г. Гарадні на Віцебшчыне.
які рыхтуе тэхнікаў-механікаў для МТС,
ПРАДАЎЖАЕ НАБОР
на 1-ы курс да 30 студзеня—34 г.
Умовы агульныя для тэхнікумаў.
Месца стыпендыя і інтэрнат. Дапаможа на гаспадарцы.
Просьба РК ЛКСМ, калгасаў, МТС, улічыць змену тэрміна пры камандыроўцы кандыдатаў у тэхнікум.
Адрас тэхнікума: БССР, г. Гарадок на Віцебшчыне, тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі—дырэкцыя тэхнікума.
Дырэкцыя.

Сектар па замежных справах ЦК т-ва ЧЫРВОНАГА КРЫЖА БССР
РАСШУКВАЕ родзічаў ніжэй пералічаных асобаў, якім належыць
атрымаць спадчыну і розныя віды грашовых узнагарод.
ПАШУКАЙ СВАЙГО РОДЗІЧА Ў ГЭТЫМ СПІСУ*)
Калі ты яго знойдзеш пішы аб гэтым зараз-жа ў ЦК т-ва Чырвонага Крыжа БССР—замежны сектар г. Менск, Першамайская, 7.
УВАГА: трэба мець на ўвазе, што прозвішчы і імёны яны перакладзеце з англійскай на рускую мову могуць быць перабалытанымі
КОБЕРСКІ Джо. КОЛВІЧ Вільям. КАМІНСКІ Пётр. КРЫСТАЛЬ Морыс. КУШМАН Данілп. КІБОРСКІ Владзіслаў. КУЧЫК Чарльз. КАЧУК Міхаіл (Майк). КАЧОР Іосіф. КАЧЫНСКІ Адам. КАЛІНСКІ Альберт. КАЛІТКО Іван (Джон). КАМЕНЧЫК Пётр. КАЛІНСКІ Алек. КАМІНСКІ Іван (Джон). КАМІНСКІ Іван М. (Джон). КАМІНСКІ Вікенці. КАНЕУСКІ Стэнлі Е. КАНОПСКІ Франк. КАПЧУК Іосіф. КАПЛАН Давід. КАРОБАНІК Ефіп (Джым). КАРАПОТАЎ Міхаіл (Майк). КАРБОЎСКІ Отто Г. КАРЧАНСКІ Клемэнс. КАЖЫМІРЧЫК Марыон. КАРОЛЬЧЫК Іван (Джон). КАРПІНСКІ Стэнлі. КАЗІКА Беньямін. КАСЛІНСКІ Франк. КАСНЕР Давід І. КАЗОН Хрысціян. КАЦОВІЧ Іосіф Г. КАЦ Адольф. КАЦ Бені. КАУФМАН Ісідар. КАУФМАН Іосіф. КАЗІМІРСКІ Антоні. КАЗІНЕЦ Якаў. КАЗЛОЎСКІ Антоні. КАЗІМІРЧУК Болеслаў. КАЗІМІРСКІ Эдуард. КОПЛЕР Вільям. КІСМАН Сэм. КІЮК (КІДЖУК) Вацлаў. КІРДЗІК Вільям. КІРЫЧЫНСКІ Андрэй. КІЛБАСА Стэнлі. КІРСКІ Вольтэр. КІСЛОЎСКІ Антоні. КІСНЕРМАН Пенько. КЛЕЙН Гары. КЛІМАСКІ Тоні. КЛІМЧАК Тоні. КЛІМЕН Хрысціян. Іосіф. КЛОС (КОЛОС) Антоні. КЛУКОЎСКІ Павел П. КНОК Гарві А. КНОЖВІЧ (НОЖВІЧ) Фрэд. КОЦАК (КОСАК) Мацвей. КОХАНІК Іван (Джон). КОСІНСКІ (КАЧЫНСКІ) Іван В. КОЦЛЕРЗ (КОСЛЕРЗ) Валенцін. КОГЛЕТ (КОЛЕТ) Метру. КОЛАР Джэмс. КАЛОДЗІШ (КАЛОДЗІЧ) Іван. КОЛОДЗЧЫК (КОЛОДЗЧУК) Аляксандр. КОМОРСКІ. КОМАРОЎСКІ. КОМАРСКІ Марцін. КОРСІ (КОРСІК) Ігнась. КОРМАН Мікалай. КАРСОНСКІ Морыс. КОРЖЫЦКО Георг. КОЗІН Ігнац. КОЗІН Ігнац. КОЗІВІК Джо. КОСЕНКОЎСКІ Лявон. КОВОВІЧ (КІВОВІЧ) Георг. КАШЭЎСКІ Антоні. КОССО Пётр А. КОВАЛЬ Кузьма. КОВАР Альберт Ф. КОВАРЫК Джэміс. КОВАЦЭРВІЧ Анца, Аріса, Агіна. КАВАЛЁЎ Іван. КОВАЛЬ Павел. КАВАЛОК Антон. Стэнлі. КАВАЛЬЧУК Міхаіл (Майк). КАВАЛЕЎСКІ Вітольд. КОВАЛІСК Іосіф. КОВАЛЬСКІ Мацвей. КОВАЛЬСКІ Міхаіл. КОВАМАСК Франк. КОВАСЕВІЧ Тодар. КОМНАЦКІ Аляксандр. КОЗАЧЫК, КОЗАЧУК, КОЗАЧОК Вася. КАЗАКЕВІЧ Вільям. КАЗАСКІ Болеслаў. КОЗЛОЎСКІ Іосіф. КОЗЛОЎСКІ Мацвей Мецёос. КАЗЛОЎСКІ Іван. КАЗЛОЎСКІ Пётр С. КОЗІК, КОЖУК Вольтэр. КРЭМЕР Іосіф. КРАПІШ Міхаіл. КРАСНЕКОВІЧ Лейб. КРАВЕЦ Давід. КРАСОВОСК Станіслаў. КРЫЕЎСКІ Стэнлі КРЫВІНСКІ Гары Міхапай. КРЫЖ Джэнс (Дзэніс, Дзям'ян). КРЫЖ Іосіф Ф. КРОПІДЛОЎСКІ Пётр В. КРУСУК (КРЫСІК Данілп. КУБАТ Іосіф. КУДЗМАН Вольтэр. КУЯЎСКІ Томаш (Томас). КОЛАК Юльян. КУЛАКОЎСКІ Чарлез. КУЛЕРЖА Франк. КУЛЕССОН Ігнац. КУЛЕЦ Мацвей. КУЛЕШ Фабіян. КУЛІКОЎСКІ Каспер Ф. КУЛОЎЯН Іван. КУРЫЛАЎ Морыс. КУРКЛІЦІС Іосіф. КУРМАН Адольф. КУРСКІ Пётр. КУШ (КІШ) Міхаіл. КУШНЕКТ Отто. КУШНІР Ігнац. КУЗНЕЦ Іосіф. КУЦІШКО Іван. КУЗЬМІНСКІ Міхаіл (Майк). КВЯТКОЎСКІ Маркель. КВЯТКОЎСКІ Іосіф. КУЧЫНСКІ Владзіслаў. КУЧ Чарльз. КАРКОЎ Іван. КОПОТ Тодэ. ЧАСК Франк. ЧРОВЕЙ Вінцэнт. 23
*) Працяг. Пачатак гл. у № «Звязда» ад 6, 8, 9, 18, 19 і 20 студзеня.

АБ'ЯВА
Вайскова-учотнай часткі Менскага Гарадскога Совета.
1. На падставе абавязковай пастановы Менскага Гарадскога Совета РСЧД ад 10 студзеня 1934 г., прыём і зняцце з учота ўсіх вайскова абвязаных радавога і малодшага начскладу, пражываючых у гор. Менску і раёне, праводзіцца вайскова-учотнай часткай Менскага гарсовета (вул. Карла Маркса, д. № 14, 2-гі паверх, пакой № 33)
2. Усе вайскова-абавязаныя, пражываючыя ў г. Менску, пры выбыцці за межы свайго раёна, незалежна ад прычыны выбыцця, абавязаны зняцца з учоту